ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 3 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 169 (4713)

Год выданьня XVI

Адкрыты ліст

Сакратару ЦК ЛКСМ Беларусі—тав. ГЕРЦОВІЧУ і камсамольцам-ударнікам г. Менску

ТАВАРЫШЫ!

Усім вам вядома становішча з электраснабжаньнем сталіцы Беларусі г. Менску. Недахват і голад у электраэнэргіі мы адчуваем на кожным нашым прадпрыемстве і ў быту.

Электрастанцыя ЦЭЦ, якая будуецца ў цяперашні момант і можа на першы час аслабіць тое напружанае становішча з электраэнэргіяй, якое існуе зараз, не фарсуецца так, як гэтага патрабуе становішча справы, з-за адсутнасьці патрэбнага кадру рабочых.

Ленінскі камсамол, які прыняў шэфства над электрафікацыяй усяго Саюзу, яшчэ невыстарчальна правяў сябе ў нашай рэспубліцы ў справе дапамогі будаўніцтву ЦЭЦ.

Пуск станцыі, намечаны партыяй і ўрадам і студзеня 1934 г., павінен быць вытрыман. Часу застаецца мала. ЦК спадзяецца, што ленінскі камсамол, арганізатар маладых байцоў за справу індустрыялізацыі нашай краіны, зьяўляючыся па праву шэфам электрафікацыі, зараз-жа па-бальшавіцку мабілізуецца на справу дапамогі будаўніцтву �цЭЦ. Трэба 300-400 камсамольцаў накіраваць на будаўніцтва, якія па-ленінску павінны біцца за тэрмін пуску станцыі. Ленінскі камсамол, які ня раз даказаў партыі і ўсёй рабочай клясе на цэлым радзе будоўляў, як ён умее змагацца за ператварэньне нашай краіны ў краіну індустрыяльную, і на гэты раз здолее арганізаваць маладых байцоў такім чынам, што наша станцыя будзе пушчана ў тэрмін.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Убраць ураджай высокаякасна, сваячасова і бяз страт, па-бальшавіцку выканаць абавязкі перад дзяржавай

Мацней барацьбу з раскраданьнем сельска-гаспадарчай прадукцыі, з антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі і кулацкімі спробамі жаць збожжа зялёным

Аб парадку засыпкі фондаў для патрэб калгасаў і разьмеркаваньні збожжа паміж калгасьнікамі па працаднёх

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

У сувязі з тым, што паасобныя калгасы ўжо выканалі гадавы плян пастаўкі збожжа дзяржаве, СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Пасьля выкананьня калгасамі сваіх гадавых абавязацельстваў па пастаўцы збожжа дзяржаве, здачы збожжа ў парадку натураплаты работ МТС і звароту пазык, калгасам прыступіць да засыпкі насенных фондаў для азімай і яравой сяўбы, стварэньня страхавых насенных фондаў у разьмеры ад 10 да 15 проц. гадавой патрэбнасьці ў насеньні (у залежнасьці ад ураджаю) і стварэньня фуражных фондаў у разьмерах гадавой патрэбнасьці аграмаджанай жывёлы.

2. СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) абавязваюць савецкія і партыйныя арганізацыі ніякіх іншых фондаў, апрача ўказаных вышэй, не ствараць.

3. Усё збожжа, якое застаецца ў калгасе пасьля выкананьня ім указаных вышэй абавязацельстваў і стварэньня ўстаноўленых вышэй фондаў, разьмеркаваць поўнасьцю паміж калгасьнікамі па працаднёх.

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) напамінаюць яшчэ раз, што ніякія сустрэчныя пляны па збожжапастаўках не могуць быць дапушчаны і вінаватыя ў дапушчэньні сустрэчных плянаў будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.

Старшыня СНК СССР В. МОЛАТАЎ (Скрабін).

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ СТАРШЫНЬ ПЕРАДАВЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ

Таварышы, вясна 1933 году была сапраўды пераможнай. БССР скончыла веснавую сяўбу 1933 году на 20 дзён раней мінулага году.

Аднак, было-б злачынствам перад камуністычнай партыяй і савецкай дзяржавай супакоіцца на дасягнутых намі посьпехах. Усялякае самасупакоеньне, дэмабілізацыя перад тварам новых, яшчэ больш адказных задач, ганьбуюць бальшавіка, ганьбуюць змагара на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

У сучасны момант БССР уступіла ў адказнейшы пэрыяд уборкі ўраджаю і барацьбы за першачарговае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай па здачы сельска-гаспадарчых прадуктаў. Пасьпяховае выкананьне гэтых задач патрабуе бальшавіцкай напружанай работы. Малейшае спазьненьне, самацёчныя настроі, апартуністычная самасупакоенасьць могуць прывесьці да глыбокіх прарываў.

Толькі шляхам своячасовай падрыхтоўкі і бальшавіцкай напружанай штодзённай работы мы выканаем гэтыя адказьнейшыя задачы.

Мы, старшыні перадавых сельсаветаў БССР, бярэм на сябе абавязацельствы па-бальшавіцку змагацца і заклікаем усе сельсаветы БССР пасьледаваць нашаму прыкладу ў правядзеньні ўборачнай кампаніі.

Мы абавязваемся ўбраць азімыя культуры на працягу 7—9 дзён, скончыўшы ўборку не пазьней 3—5 жніўня, яравыя культуры ўбраць за 7—9 дзён, скончыўшы ўборку не пазьней 12—17 жніўня.

Мы абавязваемся цераблеьне ільну капашель правесьці на працягу 8—10 дзён.

Мы абавязваемся правесьці капаньне бульбы на працягу 20—25 дзён і скончыць не пазьней 1-га кастрычніка.

Мы цьвёрда, па-бальшавіцку заяўляем, што ўказаньні правадыра нашай партыі тав. **Сталіна** аб тым, што своячасовая і датэрміновая здача збожжа дзяржаве—ёсьць першачарговая запаведь—зьяўляюцца для нас бясспрэчнай бальшавіцкай дырэктывай, за якую мы будзем змагацца з усёй упартасьцю бальшавікоў.

Збожжа першага абмалоту здамо дзяржаве. Пабудуем выразны календарны плян здачы збожжа дзяржаве. Падрыхтуем пятаную сілу, трэцюпартыі тару, прывядзем у поўны парадак масты, пазбудзімся шляхі да сховішчаў пунктаў.

Наш абавязак заключаецца ў тым, каб арганізаваць здачу збожжа, ільну і інш. тэхнічных культур дзяржаве раней вызначаных тэрмінаў. Мы абавязваемся змагацца за тое, каб на працягу жніўня і верасьня месяцаў у аспоўным выканаць дзяржаўнае заданьне па здачы збожжа дзяржаве. Мы абавязваемся адгрузіць пралетарам гораду Леніна бульбу не пазьней 15-га кастрычніка 1933 году.

Мы будзем упарта змагацца за пасьпяховае правядзеньне засеваў культур у разьмеры 1.260 тыс. га, за поўнае выкананьне ўстаноўленага партыяй і ўрадам мінімальнага пляну засеваў азімай пшаніцы ў разьмеры 60 тыс. га. Асаблівую ўвагу мы абавязваемся зьвярнуць на поўнае выкананьне плянаў зяблевага ворыва ў разьмеры 1.127 тыс. га, узьняцьця 60 тыс. га аблогаў, улічваючы яго вялізарнае значэньне для пасьпяховага правядзеньня наступнай веснавой пасеўнай кампаніі і барацьбы за павялічэньне ўраджайнасьці.

Для пасьпяховай і бяз страт уборкі ўраджаю і здачы лепшай якасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі дзяржаве, мы, старшыні перадавых сельскіх саветаў, бярэм на сябе абавязак і заклікаем усіх старшынь сельсаветаў БССР правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Арганізаваць работу па ўборцы ўраджаю такім чынам, каб забясьпечыць добраякасную і ў максымальна кароткі тэрмін ўборку, арганізаваць у кожнай брыгадзе кантрольныя пасты з ліку членаў саветаў і савецкіх актывістаў, забясьпечыўшы сыстэматычны кантроль:

а) за своячасовым выхадам на работу;

б) за правільнай расстаноўкай рабочай сілы, найбольшым рацыянальным скарыстаньнем сельска-гаспадарчых машын, інвэнтару і цягавай сілы.

2. Арганізаваць бесьперабойны абмалот збожжа, бесьперабойную работу малатарань, бесьперабойны збожжавы канвэер ад малатарні да элеватара і прыёмачнага пункту і забясьпечыць кантроль за ўлікам снапоў, возкай снапоў, выхадам прадукцыі з-пад малатарань, за ўлікам зерня і возкай яго на здатачна-прыёмачныя пункты, праз вызначэньне праверэных, адданых пар тыі і савецкай уладзе калгасьнікаў і арганізацыю на адказных вучастках кантрольных пастоў з членаў сельсаветаў і савецкага актыву.

3. Устанавіць суровы кантроль за выкананьнем калгасамі і аднаасобнікамі абавязацельстваў перад дзяржавай па здачы прадуктаў, разгортваючы спаборніцтва, падтрымліваючы і арганізуючы сацыялістычны пачын і ініцыятыву перадавікоў па скарачэньні тэрмінаў здачы і караючы ўсіх, хто будзе сам зрываць, або штурхаць другіх на шлях парушэньня бясспрэчнага закону аб пастаўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве.

4. Весьці бязьлітасную барацьбу супроць малейшай спробы клясава-варожых элемэнтаў раскрадваць або зьнішчаць ураджай. Будзем пільна ахоўваць новы ўраджай, праверыўшы калгасных аб'езчыкаў, вартаўнікоў, ачысьціўшы гэтыя адказныя пасады ад клясава-варожых, чужых, прымазаўшыхся элемэнтаў, забясьпечыўшы ва ўсіх калгасах, паселішчах надзейную супроць-пажарную ахову. Арганізуем праз сэкцыі і дэпутацкія групы, праз асобных дэпутатаў сталы кантроль за выкананьнем пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу ССР аб ахове ўраджаю.

5. Забясьпечыць абслугоўваньне калгасьнікаў у часе ўборкі ў полі шляхам арганізацыі калярацыйных заркоў, грамадзкіх сталовых, чыткі газет, выпуску штодзённых насьценгазэт і г. д.

6. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаваньне і бесьперабойную работу дзіцячых ясьлей, плянсадоў і поўнае забясьпечэньне іх неабходнымі прадуктамі і належным кіраўніцтвам.

Ставячы ў цэнтры нашай [illegible] у сучасны момант уборку ўраджаю і першачарговую здачу сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве, правядзеньне азімай сяўбы і зьяўляцьце зяблева, мы ня будзем выпускаць з поля нашага зроку і другіх задач (барацьба за разьвіцьцё жывёлагадоўлі, за каня, барацьба за фінплян, падрыхтоўка да навучальнага году і г. д.).

Мы, старшыні перадавых сельсаветаў, заяўляем сабе, што на нас у першую чаргу партыя і ўрад укладаюць абавязак па-бальшавіцку арганізаваць работу саветаў, павесьці ў бой усіх калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў за выкананьне заданьняў партыі і ўраду.

Мы абавязваемся і патрабуем ад усіх сельсаветаў БССР, і ў першую чаргу ад адстаючых сельсаветаў, павесьці рашучую барацьбу супроць сляснай дэклярацыйнасьці ў рабоце, гні ла-лібэральных адносін да выкананьня абавязкаў, супроць шкоднай дзейнасьці клясава-варожых элемэнтаў і іх агентуры—апартуністаў і перараджэнцаў, супроць саноўна-панскіх адносін да канкрэтнай апэрацыйнай работы, супроць усіх тых, хто прыкрываецца фальшыва-нацыянальным сьцягам, замест рашучай і адданай барацьбы за чарговыя гаспадарча-палітычныя задачы.

Для пасьпяховага вырашэньня і ажыцьцяўленьня пастаўленых перад намі партыяй і ўрадам задач мы абавязваемся і патрабуем ад усіх саветаў БССР вынесьці асноўную работу сельсаветаў, сэкцый, дэпутацкіх груп у калгасы, калгасныя брыгады і зьвенні, саўгасы і фэрмы. Мы абавязваемся скарыстаць на аснове разгортваньня спаборніцтва і ўдарніцтва, сыстэматычнай узаемаправеркі, абмену вопытам, ператварыўшы кожнага члена сельсавету, кожнага актывіста ў сапраўднага змагара за ўзорнае выкананьне нашых абавязкаў перад партыяй і ўрадам.

Старшыні сельсаветаў абавязаны асабістым прыкладам, лепшымі ўзорамі сацыялістычных адносін да работы, высокай сьвядомасьцю і дысцыплінавана насьцю служыць прыкладам у выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній, у выкананьні сваіх абавязкаў. Кожны член сельсавету, кожны ўпаўнаважаны дзесяцідворкі абавязан служыць прыкладам у першачарговым выкананьні ўсіх абавязкаў перад дзяржавай.

Сельсавет зможа з посьпехам выканаць сваю работу толькі ў тым выпадку, калі ён будзе апірацца на праверэны савецкі актыў, які непасрэдна ў калгасе, саўгасе, на вёсцы штодзенна будзе змагацца і весьці барацьбу за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. Асаблівае значэньне для пасьпяховай работы саветаў мае арганізацыя масавай работы сярод жанчын, больш рашучае ўцягненьне жанчын у работу саветаў і іх масавых органаў.

Саветы абавязаны цьвёрда памятаць указаньні т. Сталіна аб тым, што «жанчына ў калгасах—вялікая сіла. Трымаць гэтую сілу пад спудам—значыць дапусьціць злачынства. Наш абавязак заключаецца ў тым, каб вылучаць наперад жанчын у калгасах і пусьціць гэту сілу ў справу» (**Сталін**).

Вялікай дапамогай у рабоце на вёсцы, у рабоце саветаў зьяўляюцца створаныя партыяй і ўрадам палітаддзелы МТС, саўгасаў, як магутныя цэнтры арганізацыі мас, ператвараньне калгасьнікаў у работнікаў сацыялістычнай гаспадаркі, магутны сродак па зьнішчэньні наяўных недахопаў у нашай рабоце.

«Палітаддзелы МТС і саўгасаў зьяўляюцца адным з тых рашаючых сродкаў, пры дапамозе якіх можна будзе зьнішчаць недахопы ў самы кароткі тэрмін» (**Сталін**).

Таму наш абавязак заключаецца ў тым, каб трымаць шчыльную сувязь з палітаддзеламі МТС і саўгасаў і дапамагаць іх у рабоце.

Важную ролю ў справе барацьбы за пасьпяховую ўборку ўраджаю і першачарговую здачу сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве адыграе [illegible] сесіі ВЦВК на [illegible] сельсавет і сацыялістычнага ка пярэдніцтва паміж Савецкай Беларуссю і Заходняй вобласьцю.

Мы заклікаем саветы БССР уключыцца ва ўсесаюзны конкурс саветаў, прыняць актыўны ўдзел у спаборніцтве з Заходняй вобласьцю, наладзіць сыстэматычную праверку выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў і сапраўды па бальшавіцку змагацца за справу быць занесенымі на ўсесаюзную чырвоную дошку.

БССР мае ўсе магчымасьці для таго, каб пераможна завяршыць сельска-гаспадарчы год, зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі і ўсіх калгасьнікаў заможнымі, зрабіць гэты год апошнім годам труднасьцяй. Посьпех залежыць ад нас саміх, ад нашай волі, ад нашых намаганьняў, ад нашага ўменьня па-бальшавіцку арганізоўваць масы, сьледуючы указаньням нашага вялікага і любімага правадыра тав. **Сталіна**.

Таварышы! Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б мабілізуем усе сілы для таго, каб з посьпехам правесьці ўборку ўраджаю, выканаць абавязкі перад дзяржавай і завяваць для БССР адно з першых месц на ўсесаюзнай чырвонай дошцы.

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) на чале з вялікім правадыром партыі і рабочай клясы тав. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Скадаўшчына ў Бешанковічах

БЕШАНКОВІЧЫ (*Ад нашай брыгады*)

Учора мы паведамлялі, што ў **БЕШАНКОВІЦКІМ** раёне ўсім калгасам даведзены **СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ** па абавязковай пастаўцы збожжа. Задань ні па пастаўцы азімага жыта ў раёне павялічаны для калгасаў у сярэднім на 10 проц. у адносінах да фактычна засеянай плошчы азімых.

Як выглядае гэты кулацкі контрэвалюцыйны сустрэчны плян?

Падамо некалькі ілюстрацый.

Калгас «Магутны», Вусьвейскага сельсавету, перавыканаў плян сяўбы азімага жыта, засеяўшы **21** гэктар. Калгасу даецца заданьне, выходзячы з разьліку **24** гэктараў. Калгас імя Чарвякова засеяў **60** гэктараў азімага жыта. Яму даводзіцца заданьне на **68** га. Калгас «Зьвязда» засеяў **71** гэктар, яму даюць заданьне, выходзячы з **80 га.** Калгас «Бальшавік» засеяў **87** гэктараў азімага жыта, яму налічваюць плян здачы азімага жыта выходзячы з **98** га.

І г. д. і г. д. без канца.

Такое становішча літаральна ва ўсіх калгасах раёну за выключэньнем двух-трох, якім невядома па якой «міласьці» кулакі з райземаддзелу зрабілі скідку. Старшыня РВК **ШАХ** выпадкова неяк агаварыўся:

— Мы прымалі пад увагу глебу...

Гэтыя па сутнасьці контр-рэвалюцыйныя сустрэчныя пляны — справа рук кулацкай агентуры, якая пралезла ў райземаддзел, а іменна: былога загатчыка райземаддзелу **ДЗЯТЛА**, ця перашняга загатчыка райземаддзелу **ГАРАЎЦА** і райгранома **ЖЫЛІНСКАГА.**

Усе яны, прыкрываючыся партбілетамі, сьвядома праводзілі сваю антысавецкую кулацкую практыку. Усе яны павінны панесьці самае суровае пакараньне ад пралетарскага суда.

Але справа ня толькі ў райземаддзеле і ў гэтых трох людзях. Бясспрэчным зьяўляецца факт, што сустрэчныя пляны санкцыянаваў былы сакратар райкому **Якаўлеў**, што аб гэтых грубейшых скажэньнях ведаюць старшыня РВК **ШАХ**, упаўнаважаны СНК па загатоўках **ФАЛЬКОВІЧ**, намесьнік сакратара райкому **КАМЯНЕЦКІ** і рад іншых адказных работнікаў раёну.

А цяпер раённы кіраўнік прабуюць апраўдацца, замацаваць, затушаваць гэту справу. Калі 22 ліпеня рэдактар раённай газэты «**СТАЛІНЕЦ**» і дырэктар МТС **АГЕЕЎ** узьнялі на бюро райкому пытаньне аб сустрэчных плянах, намесьнік сакратара РК Камянецкі і ўпаўнаважаны па загатоўках Фальковіч заявілі:

— Па гэтым пытаньні ёсьць сакрэтныя пастановы. Выконвай і маўчы.

Нахабны манэўр, разлічаны на тое, каб замазаць дапушчаныя ў раёне злачынныя скажэньні.

Або яшчэ адзін факт. 26-27 ліпеня адбываўся пленум райвыканкому. На пленуме і ў дакладзе ўпаўнаважанага па загатоўках Фальковіча і ў выступленьнях іншых кіруючых работнікаў ня было ні аднаго слова аб контр-рэвалюцыйных сустрэчных плянах, даведзеных да калгасаў.

Толькі пасьля спрэчак нам. сакратара райкому партыі Камянецкі мімаходам закрануў гэта пытаньне, заявіўшы:

— Ходзяць чуткі аб сустрэчных... Каментары да гэтай заявы наўрад ці патрэбны!

Толькі поўнай стратай клясавай пільнасьці, перараджэньнем кіраўніцтва раёну можна вытлумачыць факт масавага давядзеньня сустрэчных плянаў у калгасы раёну.

Кулацкія агенты, арганізатары сустрэчных плянаў паставілі сваёй мэтай ахаяць савецкія законы, пасеяць нявер'е сярод калгасьнікаў у непарушнасьць новага закону аб цьвёрдых збожжапастаўках, дыскрэдытаваць гэты закон.

І характэрна яшчэ адна рыса ў правакацыйнай дзейнасьці кулацкіх агентаў і буржуазных перараджэнцаў, якія пралезьлі ў бешанковіцкія раённыя арганізацыі.

Яны імкнуцца ўсе збожжапастаўкі пераваліць выключна на плечы адных калгасаў, сьвядома **ЗЬМЯНШАЮЧЫ** заданьне па абавязковай пастаўцы збожжа для **АДНААСОБНАГА** сэктару.

У раёне мае месца масавае ўтойваньне зямлі, засеянай аднаасобнікамі. Па аднаасобных гаспадарках утоена ад абкладаньня каля 700 гэктараў азімых пасеваў.

Што-ж робяць бешанковіцкія кіраўнікі? Гэтыя 700 гэктараў сьвядома залічаюцца ў... яравыя. А плян сяўбы яравых па аднаасобным сэктары скарачаецца на такую-ж колькасьць—роўна на 700 гэктараў.

Вось тактыка кулацкага ахвосьця, пралезшага да руля раённага кіраўніцтва. Утаіць пасевы азімых па аднаасобным сэктары і адначасова даць сустрэчныя пляны для калгасаў, каб дыскрэдытаваць калгасны рух, узмацніць індывідуальную гаспадарку — вось якія кулацкія правакацыйныя справы дапускаюцца ў Бешанковіцкім раёне.

Характэрна, што ў выніку такой кулацкай палітыкі райземаддзелу многія кулакі і цьвёрдазаданьнікі ў раёне і па сёньняшні дзень ня прыцягнуты да збожжаздачы. Аб усіх гэтых фактах і райком партыі, і райвыканком добра праінфармаваны, бо ўсё гэта робіцца на іх вачох.

Прысядзібныя вучасткі ў калгасах раёну празьмерна пашыраны. На сядзібах засеяны: жыта, пшаніца, ячмень. Аднак, гэтыя пасевы ня ўлічаны і ўтоены ад абкладаньня па цьвёрдых пастаўках збожжа.

Адзін яркі прыклад. Вусьвейскі сельсавет. Калгас «Новы сьвет». У самога старшыні калгасу Ўладзімера Талочкі на гэктарным прысядзібным вучастку засеяны жыта, ячмень і іншыя культуры. Абавязацельства яму ўручана толькі на здачу 6,38 пэнтн. бульбы з разьліку 0,75 га.

Кулацка-рвацкім месьніцкім тэндэнцыям не [illegible] кіраўнічага адпору. У раёне мае [illegible] новага [illegible] вясной, зараз у [illegible] месяцы зноў разданы. І [illegible] не дзяржаве, а ў [illegible] на [illegible] размоў для ўласнага [illegible]. Калгас «Бальшавік», Сокараўскага сельсавету, зжаў каля 3 гэктараў жыта і адразу разьмеркаваў яго сярод калгасьнікаў.

А ў гэты час мясцовыя работнікі дэкларацыйна абяцаюць здаць чырвоным абозам 1 жніўня 30 проц. гадавога пляну.

Нахабная хлусьня, балбатня, якою клясавы вораг і яго агентура маскуюць свае манэўры.

28 ліпеня па нашай ініцыятыве бюро РК, нарэшце, разгледзела пытаньне аб сустрэчных плянах.

Райграпом Жылінскі выключан з партыі і аддаецца пад суд. Былому загатчыку райза Дзятлу, аднак абвешчана толькі суровая вымова, а цяперашняму загатчыку райза Гараўцу яшчэ больш пашанцавала, справу аб ім толькі перадалі ў РКК.

Гэтыя лібэральныя меры, ужытыя ў адносінах да людзей, якіх трэба караць самым бязьлітасным чынам, як арганізатараў кулацкай правакацыі, ёсьць лёгкім працяг тэй гнілалібэральнай прымірэнчай пазыцыі, на якой стаіць раённае кіраўніцтва.

Трэба спадзявацца, што ўсе арганізатары контр-рэвалюцыйных сустрэчных плянаў і тыя, хто іх патурае, хто іх пакрывае, атрымаюць заслужанае пакараньне.

Кулацкая практыка ў Бешанковіцкім раёне павінна быць неадкладна спынена, а дапушчаныя грубейшыя скажэньні неадкладна выпраўлены.

А. Мікуцкі, Я. Шылянкоў.

ВЫШЭЙ КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ!

Рашучы адпор клясавым ворагам і іх агентам!

Убраць азімыя да 5-га, а яравыя да 12-17 жніўня—зусім рэальная і абавязковая задача.

Партыя не пацерпіць дробна-буржуазнай распушчанасьці, безадказных адносін да ўстаноўленых тэрмінаў. Малейшае спазьненьне з уборкай на руку клясавым ворагам.

Але недабіты кулак, шкоднік, іх агенты бяруць стаўку ня толькі на зацягваньне ўборачных работ.

Вораг правакуе ўборку зялёнага нясьпелага жыта. Вораг дамагаецца страт пры самой уборцы.

Аб чым сыгналізуюць матар'ялы з месц?

Аб тым, што многія арганізацыі ня выкрываюць новай тактыкі кулака, новых манэўраў кулацкага ахвосьця.

Надвароі. Знаходзіцца шкодная работнікай, якая захаляпіоцца «лявацкай» рулёй у сустрэчныя тэрміны. Знаходзіцца нямала людзей, якія з бурным «лявацкім» энтузіязмам праводзяць уборку ў парадку, так сказаць, кавалерыйскага галопу.

Возьмеце Сіроцінскі раён. Тут уборка пачалася яшчэ тыдзень назад. І мясцовыя работнікі лічаць гэта за сваю заслугу, за посьпех. Якая, аднак, сапраўдная цана сіроцінскім перамогам?

Аказваецца, у раёне ў масавым маштабе жнуць зусім зялёнае, нясьпелае жыта.

Хіба ня ясна, што сіроцінскія галавацяпы сваім спартыўным азартам, сваёй «лявацкай» пагоняй за «тэмпамі», толькі дапамагаюць кулаку, льлюць ваду на млын яго шкодніцкіх махінацый.

Аналёгічнае становішча і ў Менскім раёне. Вы ўбачыце па палёх менскіх калгасаў, як убіраецца зусім нясьпелае і зялёнае жыта.

І ўсё гэта абураючае галавацяпства, уся гэта шкодная гульня ў сустрэчныя тэрміны прыкрываецца пры гожымі рапартамі, гучнымі дэкларацыямі аб «ударнай уборцы»...

Каму гэта на руку, як не кулаку? Што гэта, як не ашуканства дзяржавы, як не падрыў калгасных даходаў на выгоду клясавым ворагам?

Мы маем на ўвазе Хойніцкі раён. Характэрнай для раёну ілюстрацыяй зьяўляецца калгас «Чырвоны араты». Раённыя арганізацыі пасьпяшылі хутчэй паслаць рапарт у Менск, што гэты калгас першым у раёне здаў збожжа дзяржаве.

Якое, аднак, збожжа?

Абмалот праводзіцца ў калгасе ў канвэерным парадку. Проста з пад сярпа і жнівяркі на малатарню. Цэлы дзень жнуць, а назаўтра раніцою прыступаюць да абмалоту. А ў выніку—непрасушанае збожжа дае высокі процант вільготнасьці. Мясцовы загатпункт ледзь прыняў ад гэтага калгасу збожжа па 4 гатунку, бо яно было ніякай жакасьці.

З такімі, так сказаць, «канвэернымі» настроямі трэба рашуча змагацца. Яны павесны клясавым ворагам і прадыктаваны кулацкім імкненьнем ашукаць дзяржаву, даць дзяржаве ніжэйшакаснае, вільготнае збожжа.

Уборка зялёнага жыта, абмалот вільготнага збожжа—кулацкая справа.

Супроць «лявацкіх» сустрэчных тэрмінаў, супроць спроб здаць дзяржаве ніжэйшакаснае збожжа!

Партыя і ўрад устанавілі цьвёрдыя тэрміны ўборкі азімых і яравых. Расьцягваньне гэтых тэрмінаў, спазьненьне з уборкай—злачынства, дапамога кулаку.

Але той, хто пад шыльдай «датэрміновай уборкі» дае «лявацкія» сустрэчныя тэрміны, хто дапускае ўборку зялёных, нясьпелых азімых і яравых, хто пакіроўвае на малатарню зялёнае непрасушанае, вільготнае збожжа—той ашуканец дзяржавы, памочнік кулака.

Так і толькі так стаіць пытаньне. Аснова асноў, задача задач у тым, каб своячасова і добра правесьці ўборку і пастаўкі збожжа.

Якасьць уборачных работ, якасьць абмалоту—важнейшае рашаючае пытаньне.

Трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што якасьць непасрэднай уборкі ў нас яшчэ не пастаўлена на патрэбную вышыню.

Возьмеце, напрыклад, калгасы Рэчыцкага, Хойніцкага і іншых раёнаў. Тут уборка ідзе ўжо звыш двух тыдняў. Прайдзеце, аднак, па ўбраных палёх і вы нярэдка ўбачыце палі з выслы нізкатых каласоў.

Вілка ў спапы, а гэта—неабходная і абавязковая мера барацьбы супроць страт, — не арганізавана. У тым-жа калгасе ўся зжатая азіміна так і ляжыць раскіданай па палёх.

Вораг цягнецца і да малатарні. Ён прабуе арганізаваць страты, пакражы пры абмалоце.

Патрэбна асаблівая пільнасьць, асаблівая пасьцярожанасьць!

Убраць і абмалаціць увесь ураджай бяз страт, убраць і абмалаціць у тэрміны, устаноўленыя партыяй і ўрадам, своячасова здаць збожжа дзяржаве і збожжа самай высокай якасьці—у гэтым цяпер сутнасьць работы ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

Абавязацельствы па цьвёрдых пастаўках маюць сілу закону і яны павінны быць бязумоўна, безагаворачна выкананы своячасова, сумленна і добра.

Гэта—сьвяшчэнны доўг кожнага калгасу, кожнага працоўнага аднаасобніка.

Клясавы вораг дасканала ўяўляе ўсю сілу, усё рашаючае значэньне новага закону аб збожжапастаўках. І адсюль яго правакацыйная тактыка—ахаяць нашы савецкія законы, пасеяць сярод калгасьнікаў нявер'е ў іх непарушнасьць, дыскрэдытаваць новы закон аб збожжапастаўках.

У гэтай сувязі матар'ялы аб Бешанковіцкім раёне, якія мы сёньня публікуем у «Зьвязьдзе», ёсьць трывожны сыгнал.

Нядаўна ўсе калгасьнікі Савецкага Саюзу мелі магчымасьць пераканацца, наколькі партыя і ўрад бязьлітасна караюць парушальнікаў новага закону аб цьвёрдых збожжапастаўках.

Мы маем на ўвазе справу былых кіраўнікоў Скадаўскага раёну (УССР), якія далі калгасам сустрэчныя пляны па збожжапастаўках. Арганізатары сустрэчных плянаў выключаны з партыі і адданы пад суд. Скадаўшчына, аднак, мае месца і ў нас у БССР.

Бешанковіцкія раённыя кіраўнікі (пачынаючы ад райкому партыі і канчаючы ўпаўнаважаным СНК па загатоўках) сталі на шлях нахабнейшай, злачынньнейшай дыскрэдытацыі закону аб цьвёрдых збожжапастаўках.

Яны фактычна санкцыянавалі правакацыйную тактыку кулацкіх агентаў з райземаддзелу, які павялічыў усім калгасам абавязацельствы па пастаўках азімага жыта на 10 проц. у парадку сустрэчных плянаў.

Арганізатары гэтай нахабнай кулацкай праваакацыі і іх патральнікі, іх абаронцы павінны прадстаць неадкладна перад пралетарскім судом. Буржуазныя перараджэнцы, якія пралезьлі да руля раённага кіраўніцтва, павінны панесьці найстражэйшую адказнасьць.

Бешанковіцкая справа — рашучае папярэджаньне. Яна патрабуе настойлівай, пістомнай барацьбы супроць малейшых вылазак клясавых ворагаў і іх агентаў, рашучага ўзмацненьня нашай клясавай бальшавіцкай пільнасьці!

Масавай арганізацыяй чырвоных абозаў калгасы і працоўныя аднаасобнікі адзначылі 1-га жніўня

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Напярэдадні 1 жніўня ў чырвоным абозе прынялі ўдзел **10 калгасаў.** На склады Загатбожжа паступіла 5.472 кгр. збожжа. Першы квіток атрымаў калгас імя **Сталіна**, Харламаніцкага сельсавету, які здаў дзяржаве з першага абмалоту 267 кгр. збожжа. Гэты калгас адным з першых у раёне скончыў веснавую сяўбу, праполку і цяпер, у часе ўборкі і збожжаздачы, не здае тэмпаў.

Следам за ім ідзе калгас **«Палітаддзелец»**, які здаў дзяржаве 900 кгр. жыта, калгас імя **Молатава** здаў 786 кгр., калгас **«Копас»**—500 кгр.

У чырвоным абозе прынялі ўдзел і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Першы квіток атрымала аднаасобніца **Корбут Параска.**

Трэба адзначыць, што ўжо выяўляюцца **шкодныя тэндэнцыі з боку некаторых калгасаў здаць дзяржаве нядобракаснае збожжа.** 30 ліпеня калгас **«Чырвоная зорка»**, Жыцькаўскага сельсавету, прывёз на склады 30 кгр. мокрага жыта. **ЧЫКУН.**

* * *

РАГАЧОЎ. Ва ўсебеларускім чырвоным абозе 1 жніўня прымала ўдзел 13 калгасаў і 36 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Раённымі арганізацыямі была наладжана таварыская сустрэча збожжаздатчыкаў. Загатоўчы апарат працаваў бесьперабойна. Добра працавалі ларкі, чайная, бюро даведак, каса Дзярж банку, аптчадкаса і мэдпункт. У дзень прыезду абозаў быў выпушчан спэцыяльны нумар раённай газэты і газэты палітаддзелу. **ВЯРХОЎСКІ.**

* * *

ВОРША. (Па тэлефону).

У дзень 1 жніўня на арпшанскі пункт Загатбожжа прывезьлі здаваць збожжа 11 калгасаў, большасьць якіх абслугоўваюцца МТС.

Прыезд калгасаў са збожжам вызьвіўся для загатоўчых арганізацый нечаканым. Кантора Загатбожжа да сустрэчы здатчыкаў не падрыхтавалася. Таксама нечаканым зьявіўся абоз і для каапэрацыі. У ларку, апрача папярос, нічога не прадавалі. Культурнае абслугоўваньне здатчыкаў зусім не наладжана, нават радыё і тое не працавала. Работнікі Загатбожжа лічацы, што масавая здача збожжа пачнецца яшчэ ня скора. Па думцы адказнага работніка Загатбожжа **Пузрына** «масавы паток збожжа пачнецца не раней, як праз дзён дзесяць, і да таго часу яшчэ можна будзе падрыхтавацца». **КІПЕР.**

* * *

СТАРЫЯ ДАРОГІ. У апошнія дні калгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі аднаасобнікаў прыступілі да масавай уборкі збожжавых. 1-га жніўня быў арганізован чырвоны абоз. Усяго ў абозе прымалі ўдзел 28 калгасы і 69 працоўных аднаасобных гаспадарак. **ПЯРШУКЕВІЧ, МАРШАК.**

* * *

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ. Перадавымі калгасамі ў дзень 1 жніўня здана 20 тон збожжа. Калгас **«Гофінунг»** здаў 2.731 кгр., **«Трактарыст»**—2.597, **«Камінтэрн»**—2.474, **«Улада Саветаў»** — 1.826. Абозы суправаджалі лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі. Калгасьнікі абавязаліся да 10 жніўня выканаць поўнасьцю пляны па здачы азімых. У часе здачы збожжа сярод здатчыкаў быў арганізован збор сродкаў на пабудову авіяэскадрыльлі імя Кагановіча. **ЛЯВОНЕНКА.**

* * *

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону). Калгасы Маслілеўшчыны чырвонымі абозамі 1-га жніўня здалі дзяржаве тысячу пудоў жыта і ячменю. Першы квіток атрымаў калгас імя **Варашылава**, Цішоўскага сельсавету. Перадавікамі збожжапастаўкі зьяўляюцца калгасы **«Расьсьвет»**, **«Улада саветаў»**, **«Перамога»**, **«Другая пяцігодка»**, **«Ударны»** і **«

Пастановы ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦККК КП(б)Б

АБ УБОРЦЫ, АБАВЯЗКОВАЙ ПАСТАЎЦЫ ДЗЯРЖАВЕ і АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

У гэтым годзе ёсьць значна большыя магчымасьці пасьпяховай уборкі і своячасовай пастаўкі дзяржаве бульбы, чым у мінулым годзе. Рашаючымі прадпасылкамі гэтага зьяўляюцца: скончэньне сяўбы бульбы на 15-20 дзён раней, чым летась, лепшыя якасныя паказальнікі сяўбы, посьпехі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і ўзрошая актыўнасьць калгасных мас, закон пра абавязковую пастаўку бульбы дзяржаве замест кантрактацыі, арганізацыя палітаддзелаў у МТС і саўгасах, праведзеная ачыстка МТС, саўгасаў і калгасаў ад кулацкіх і клясава-варожых элемэнтаў.

Выкананьне пляну заготовак і здачы бульбы дзяржаве зьяўляецца пралетарскім абавязкам у справе снабжэньня прамысловых цэнтраў як Ленінграду, Масквы, так і БССР. Між тым, многія зямельныя, заготоўчыя, савецкія і партыйныя арганізацыі да гэтага часу яшчэ не паставілі ў цэнтр сваёй штодзённай работы падрыхтоўку да ўборкі, прыёмку і адгрузку бульбы Ленінграду, як адну з важнейшых гаспадарча- палітычных задач.

Саўгасы, МТС і калгасы недапушчальна ганебнымі тэмпамі праводзяць рамонт бульбаўборачнага інвэнтару. Да гэтага часу ў радзе раёнаў яшчэ ня скончана першапачатковая пратоўка і абсыпка бульбы, што пагражае зьніжэньнем ураджайнасьці.

Рад раёнаў ня скончылі перадачы і афармленьня абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве. Падрыхтоўка тэхнічнай базы да прыёмкі бульбы ідзе нездавальняюча; заготпункты забясьпечаны крытымі памяшканьнямі толькі на 35-40 проц., а таксама слаба забясьпечаны вагамі, гірамі і г. д.; ня зьвернута адпаведная ўвага на ўкамплектаваньне заготпунктаў адпаведнымі работнікамі (загадчыкі пунктаў, прыёмшчыкі і г. д.).

Нездавальняючая падрыхтоўка да ўборкі і пастаўкі дзяржаве бульбы сьведчыць аб тым, што многія зямельныя і заготоўчыя арганізацыі, а таксама РВК і РК КП(б)Б ня ўлічылі ўрокаў мінулага году, калі ў разультаце гніліпідэральных адносін да кулацкага сабатажу саўгасы, калгасы і аднаасобнікі зацягнулі ўборку бульбы да лістапада, загатоўку — да 1 лютага 1933 г. і адгрузку Ленінграду — да 1 сьнежня.

Разам з тым усе зямельныя, заготоўчыя, савецкія і партыйныя арганізацыі павінны абавязкова ўлічыць, што ў гэтым годзе рэшткі кулацтва і клясава-варожых элемэнтаў будуць старацца сарваць пасьпяховае выкананьне ўборкі і пастаўкі бульбы дзяржаве. Пленум ЦК і ЦККК рашуча папярэджвае супроць самацёчных настрояў у паасобных работнікаў і патрабуе арганізацыі самага сакрушальнага адпору спробам клясавага ворага сарваць своячасовую ўборку і здачу бульбы дзяржаве.

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць райупаўкамзагі, раённыя выканаўчыя камітэты і РК КП(б)Б арганізаваць масавую праверку правільнасьці перадачы абавязацельстваў па бульбе, а ў тых раёнах, у якіх яшчэ ня скончана перадача і афармленьне абавязацельстваў, на працягу 5 дзён поўнасьцю скончыць гэту работу.

2. Устанавіць, што да 1 кастрычніка павінна быць поўнасьцю скончана па ўсёй БССР уборка бульбы, прычым уборачны пэрыяд павінен цягнуцца ня больш 15-20 дзён. Устанавіць капаньне бульбы па меры пасьпяваньня, не чакаючы агульнага высьпяваньня.

3. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Саўгасаў, трактарацэнтры да 5 жніўня скласьці і давесьці да кожнага саўгаснтрасту, раёну і МТС пляны ўборкі бульбы з сутачным заданьнем, а раённым зямельным аддзелам, саўгастрэстам і МТС да 10 жніўня давесьці такія пляны з цьвёрдым сутачным заданьнем да кожнага калгасу і саўгасу, а па аднаасобных гаспадарках — да кожнага пасёлку.

4. Абавязаць усе саўгастрэсты, трактарацэнтры, МТС і раённыя зямельныя аддзелы, пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў, поўнасьцю скончыць да 1 жніўня рамонт усіх бульбакапалак, забясьпечыўшы максымальнае іх скарыстаньне на ўборцы. Папярэдзіць усіх дырэктароў МТС, саўгасаў і старшынь калгасаў, што невыстарчальнае выкарыстаньне бульбакапалак на ўборцы будзе разглядацца, як супраціўленьне мерапрыемствам па машынізацыі сельскай гаспадаркі.

5. Устанавіць на час уборкі, як абавязковы мінімум прадукцыйнай работы трактарнай бульбакапалкі — у 40 га, конной — 25 га. Даручыць НКЗ і ўпаўнаважанаму НК саўгасаў устанавіць дзённую нагрузку работы на кожную машыну.

Выходзячы з маляўнасьці бульбакапалак і ўказаных норм выпрацоўкі, устанавіць наступны плян машынізаванай уборкі:

ПА НК ЗЯМЛЯРОБСТВА:

Саўгародтрэст — 70 проц.
Насентрэст — 50 проц.
Бульба-гародны трактарацэнтр — 17 проц.
Збожжатрактарацэнтр — 6 проц.
Ільнаводны трактарацэнтр — 4 проц.

Калгасы, якія не абслугоўваюцца МТС — 4 проц.

Па саўгасах сыстэмы Упаўнаркамсаўгасаў — 57 проц.

6. Для своячасовага і бесьперабойнага выкананьня пляну пастаўкі бульбы дзяржаве абавязаць дырэктароў МТС, саўгасаў, старшынь калгасаў і загадчыкаў раённых зямельных аддзелаў арганізаваць уборачныя работы так, каб разам з уборкай праводзілася пераборка, сартаваньне, прасушка бульбы і адпраўка яе на пункты здачы і пагрузкі непасрэдна з поля.

7. Устанавіць, што дастаўленая на пункты здачы і пагрузкі неперабраная і непрасушаная бульба ня будзе залічвацца ў плян здачы, а факт пастаўкі такой нядобракасная бульбы будзе разглядацца, як спроба зрыву пастаўкі бульбы дзяржаве.

8. Для барацьбы са стратамі абавязаць усе саўгасы, калгасы і аднаасобныя гаспадарні пасьля ўборкі бульбы правесьці бараніваньне і пераворваньне бульбяніча для паўторнай выбаркі бульбы, якая засталася ў зямлі.

Усю выкапаную бульбу перабраць, вчысьціць ад зямлі, гніілых і бітых апубляў.

Не пазьней, чым за 5-7 дзён да пачатку ўборкі бульбы, правесьці масавае скошваньне бульбяніка, як меру барацьбы з бульбяной хваробай — фітаўторыяй. Голны скошаны бульбянік скарыстаць на сілас.

9. Абавязаць райза, МТС, саўгастрэсты да 15 жніўня выявіць усе саўгасы і калгасы, якія маюць пасевы гатунковай бульбы і ўзяць ад іх абавязацельствы аб захаваньні ўсяго ўраджаю гатунковай бульбы на насеньне. Адначасова арганізаваць замену гатунковай бульбы не звычайнаю з тым, каб ні ў якім выпадку не затрымліваць выкананьня дзяржаўных планаў загатовак бульбы.

10. Забараніць саўгасам і калгасам атрымліваць якія-б там ні было фонды бульбы да поўнага выкананьня пляну дзяржаўных загатовак.

Забараніць з 1 жніўня 1933 г. да поўнага выкананьня зацьверджанага гадавога распубліканскага пляну пастаўкі бульбы дзяржаве і ссыпкі (пасьля выкананьня паставак дзяржаве) насенных фондаў, калгасны і індывідуальна-сялянскі гандаль бульбай, а таксама дазагатоўкі бульбы.

11. Для захаваньня ўраджаю бульбы ад пакражы, абавязаць усе саўгасы і калгасы з моманту пачатку высьпяваньня бульбы забясьпечыць ахову пасеваў бульбы, у часе капаньня бульбы арганізаваць штодзённае ўзважваньне яе, не дапускаючы пакіданьня нанач выкапанай і няўзважанай бульбы. Пры адсутнасьці вагі практыкаваць прыстасаваньне заўчасна загатоўленых і ўзважаных на вагах яшчыкаў, арганізаваўшы ўлік і запіс атрыманай бульбы. Асабліва неабходна ў галоўных прыёмачных пунктах устанавіць вазавое ўзважваньне.

12. Абавязаць Белкаапсадагароднину і яе раённыя зьвеньні—райсаюзы, райзагі, Белсадгароднину і яе раённыя канторы, а таксама заводы броварнай і крухмальнай прамысловасьці, пад адказнасьць іх кіраўнікоў, да 1 жніўня скончыць арганізацыю і пабудову прыёмачных пунктаў каля чыгункі, прыстаняй і заводаў, забясьпечыўшы іх да ўказанага тэрміну неабходным інвэнтаром (вагамі, гірамі, прыёмачнымі квіткамі, ліхтарнямі, апаламі і г. д.).

РВК, РК КП(б)Б і райупаўкамзагам устанавіць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам падрыхтоўкі тэхбазы да прыёмкі і адгрузкі бульбы.

13. Прапанаваць упаўнаважанаму Народнага камісарыяту цяжкай прамысловасьці тав. Амбражунасу выканаць заказ загатарганізацыі на вагі і гіры не пазьней 1 жніўня 1933 г.

14. Прапанаваць упаўнаважанаму Народнага камісарыяту лясной прамысловасьці тав. Розіну забясьпечыць будаўніцтва новых прыёмачных пунктаў несаматар'яламі згодна нарадаў, а прыёмна - пагрузачныя пункты апокамі. Абавязаць загатоўчыя арганізацыі свая часова падаць заяўкі.

15. Даручыць упаўнаважанаму Народнага камісарыяту шляхоў зносін тав. Згле на працягу пяці дзён паставіць пытаньне перад Народным Камісарыятам Шляхоў Зносін аб дачы катэгарычнага распараджэньня ўсім эксплёатацыйным раёнам на тэрыторыі БССР аб дазволе загатарганізацыям пабудову прыёмачна-перавалачных пунктаў па бульбе непасрэдна ў прырэйкавай пэлясе або пагрузачна-выгрузачных пунктах, дазволіўшы пакрыць іх дошкамі, фанэрай і глінабітам.

Разам з тым прасіць НКШЗ аб дачы распараджэньня па ўсіх чыгуначных станцыях БССР аб прадастаўленьні загатарганізацыям на арэндных умовах чыгуначных прыёмачна - пагрузачных пабудоў (пакгаузы, рампы, пляцоўкі), абавязаўшы станцыйную адміністрацыю адрамантаваць пад'езды да гэтых пабудоў.

16. Абавязаць упаўнаважанага НК Воднага транспарту тав. Пачабута неадкладна закончыць суднарамонт, асабліва неправага рэчплёту, і забясьпечыць перавозку бульбы выстарчальнай колькасьцю крытых баржаў. Даручыць плян узьняцьця цаліны на бягучы год і ў далейшым—на другую пяцігодку ў цэлым і даць заданьне раёнам.

Пленум ЦК і ЦККК лічыць адзнай з важнейшых задач усіх партыйных, савецкіх, зямельных органаў і МТС—асваеньне новых зямель, узьняцьце цаліны і пашырэньне пасеваў азімай пшаніцы. Даныя ўказаньні па гэтых пытаньнях ЦК УсеКП(б) павінны быць безагаворачна, па-бальшавіцку выкананы. Даручыць бюро ЦК і СНК устанавіць плян і заданьне раёнам па пушчэньні глебы.

4. Пленум падкрэсьлівае асабліва вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне пашырэньня пасеваў азімай пшаніцы ў БССР і патрабуе ад Наркамзему, РК і РВК бязумоўнага і поўнага выкананьня пляну пасеву пшаніцы, адводу лепшых угноеных вучасткаў пад пшаніцу, скарыстаньня ўсяго ўраджаю пшаніцы пасьля выкананьня пляну здачы дзяржаве выключна на пасеў, арганізацыі абменных апэрацый па насенньні пшаніцы, забараніўшы скарыстаньне пасеўнага матэрыялу для спажывецкіх патрэб.

5. Пленум зварачае ўвагу партыйных і савецкіх арганізацый на тую акалічнасьць, што ў бягучым годзе толькі адна трацяя частка азімага кліну будзе сеяцца па чыстым папары і ня менш дзьвёх траціх павінне быць заселена на плошчах занятых папараў яравымі культурамі, што патрабуе асабліва выразнай і арганізаванай работы па падрыхтоўцы плошчаў пад пасеў.

Пленум абавязвае РК, палітаддзелы, РВК, дырэктароў саўгасаў і МТС арганізаваць уборку яравых з такім разьлікам, каб плошчы пад азімую сяўбу былі ўзораны ні ў якім выпадку не пазьней 10 жніўня, прычым у першую чаргу для пасеву азімых (пасьля чыстага папару) павінны быць скарыстаны плошчы з-пад вікі, раньняй бульбы і сіласных культур.

Адзначаючы нездавальняючы ход увядзеньня севазвароту ў большасьці раёнаў, пленум абавязвае Наркамзем, РК, палітаддзелы і РВК аддаць больш увагі гэтай справе і дабіцца бязумоўнага перапому з тым, каб ужо азімая сяўба праходзіла ў адпаведнасьці з севазваротамі кожнага калгасу. Адначасова пленум папярэджвае супроць тэндэнцый, якія ёсьць у паасобных райпартарганізацыях і зямельных органах, накіраваных на зьмяншэньне пляну збожжавых пасеваў. Пленум лічыць, што за бясьпечыць поўнае выкананьне пляну азімай сяўбы і сяўбы пшаніцы на лепшых глебах, а таксама зрабіць устойлівымі севазвароты можна толькі пры ўмове поўнага выкананьня пляну ўзьняцьця цаліны. Гэту задачу кожны раён, кожны калгас, саўгас павінны выканаць поўнасьцю. Наркамзем абавязан распрацаваць і апублікаваць агра правілы правядзеньня азімай сяўбы, абавязковыя для кожнай гаспадаркі.

Пленум ставіць перад усёй КП(б)Б, як адну з важнейшых палітычна-гаспадарчых задач—поўнае і своячасовае правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў па азімай сяўбе, па пашырэньні пасеўнага кліну азімай пшаніцы, па зяблевым ворыве і ўздыме цаліны і патрабуе ад Наркамзему, РК КП(б)Б, палітаддзелаў і РВК сапраўды бальшавіцкай работы па выкананьні гэтых мерапрыемстваў поўнасьцю ва ўстаноўленыя тэрміны.

АБ ХОДЗЕ ЧЫСТКІ ПА МЯСАКАМБІНАТУ

Пастанова бюро ГК КП(б)Б ад 24 ліпеня 1933 году

Заслухаўшы паведамленьне тав. Гарагляда аб ходзе чысткі партарганізацыі па мясакамбінату, — бюро ГК КП(б)Б канстатуе:

1. Ужо першыя вынікі работы па чысткі выявілі наяўнасьць засьмечанасьці як сярод рабочых, так і ў партарганізацыі кулацкімі, разлажнічуючымися элемэнтамі, якія прымазаліся да партыі.

Трыкутнік камбінату, які павінен быў дапамагчы ўскрыць гэтыя факты аказаньнем максымальнай дапамогі камісіі па чысткі, фактычна ўзначаліў зацішак самакрытыкі, запалохваў работнікаў не выступаць супроць маючых месца вы палкаў кражы, сямейнасьці і кругавой парукі.

2. Факт адмаўленьня ад прыняцьця сацыялістычнага рахунку па якасьці работы, прад'яўленага заводам «Бальшавік», пацьвярджае, што трыкутнік камбінату, ня гледзячы на тое, што да сённяшняга дня мае месца дрэнная адыманьне скуры, пакрываў дрэнную якасьць работы, сямейнасьць, кругавую паруку, аказаўшыся зброяй у руках клясава-варожых элемэнтаў на камбінаце. Гэта яшчэ раз пацьвярджае, што трыкутнік камбінату згубіў клясава-партыйнае чуцьцё, выступіў супроць сацыялістычных метадаў працы і мерапрыемстваў, мабілізуючых рабочых на выкананьне якасных паказальнікаў.

3. Факты зваленьня работніц, пакі даньне на рабоце былых кулакоў на рашаючых вучастках камбінату (нач. халадзільніка — былы кулак), падпал рабочых па нацыянальных адзнаках (яўрэі—па ўбоі рагатай жывёлы, беларусы — па ўбоі сьвіней), наяўнасьць «бураючых фактаў антысэмітызму і надварот: звальненьне з работы беларускіх работніц і назначэньне на іх месца работніц яўрэек, сьведчыць, што трыкутнік і бюро калектыву, у выніку страты партыйнага чуцьця, яўна садзеяў нічаў шкодніцкім кулацкім справам, распальваньню нацыянальнай нянавісьці і інш.

4. Наяўнасьць фактаў шкодніцтва (зьмяншэньне тэмпэратуры на халадзільніку), факты пакражы (рад камуністаў краілі мясапрадукты) і трыкутнік быў у гэтым замешан.

Яўнае апашленьне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, гаспадарча - разрахункова брыгада створана ў выглядзе адной сям'і, наяўнасьць сярод герояў першай пяцігодкі яўных кулакоў, сальнікаў у мінулым—лішні раз паказвае, што трыкутнік аказаўся абаронцам клясавага ворага.

Выходзячы з гэтага, бюро ГК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Неадкладна адхіліць ад работы ўвесь трыкутнік — дырэктара Варанкова, сакратара ячэйкі Саўко і старшыню заўкому Кунніна, а бюро парткалектыву распусьціць.

2. Прасіць гар. камісію па чысткі прыпыніць работу па чысткі калектыву з тым, каб скарыстаць апошнія дні чысткі для поўнага выяўленьня сапраўднага становішча па камбінаце.

Для пасьпяховага правядзеньня чысткі на мясакамбінаце стварыць грамадзкі і партыйны буксір.

3. Даручыць тав. Геперу — сакратару парткалектыву заводу «Бальшавік» — сёньня-ж абмеркаваць гэта пытаньне на сходах рабочых па цэхах.

Выдалучыць буксірныя брыгады на менш 10 лепшых праверэных ударнікаў на чале з тав. Гелерам і накіраваць іх для дапамогі камісіі па чысткі.

4. Даручыць тав. Гершону сёньня-ж паведаміць аб гэтым на агульным сходзе рабочых і разам з камісіяй па чысткі з ліку праверэных камуністаў склясьці часовую арганізацыю па кіраўніцтву справамі камбінату.

5. Даручыць пракуратуры тэрмінова пачаць сьледзтва супроць раскрадальніка дзяржаўных прадуктаў і важымшчыкаў самакрытыкі. Пасьля скончэньня сьледзтва заслухаць інфармацыю аб гэтым спецыяльна на пасяджэньні сакратарыяту ГК.

6. Прапанаваць аргбюро сёньня-ж абмеркаваць антыпартыйны ўчынак у адносінах няпрыняцьця сацыялістычнага рахунку заводу «Бальшавік» і выдалучыць брыгаду з лепшых ударнікаў камбінату, накіраваўшы іх на сход заводу «Бальшавік» для распумачэньня рабочым аб антыпралетарскім учынку камбінату.

7. Даручыць гарпрафсавету тэрміново заняцца пытаньнямі засьмечанасьці камбінату і свае канкрэтныя прапановы ўнесьці на бліжэйшае пасяджэньне сакратарыяту ГК.

8. Гарком КП(б)Б заклікае ўсіх каму ністаў і рабочых камбінату разгарнуць сапраўдную бальшавіцкую крытыку і самакрытыку, каб дапамагчы камісіі па чысткі выявіць усе недахопы, якія ёсьць у рабоце камбінату.

9. Прапанаваць усім парткалектывам і ячэйкам абгаварыць на бліжэйшым партсходзе гэта рашэньне

Сакратар Менгаркому КП(б)Б
КУДЗЕЛЬКА.

АБ АЗІМАЙ СЯЎБЕ, УКАРАНЕНЬНІ ПАСЕВАЎ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ, ЗЯБЛІВЕ І УЗДЫМЕ ЦАЛІНЫ

Надзючы выключна важнае значэньне поўнаму і своячасоваму выкананьню пляну азімай сяўбы, VII аб'яднаны пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Устанавіць плошчу азімай сяўбы па БССР у бягучым годзе ў 1.260 тыс. га, у тым ліку: саўгасы ўсіх сыстэм—36 тыс. га, калгасы—748 тыс. га і аднаасобнікі —476 тыс. га. Пасеўную плошчу азімай пшаніцы вызначыць, як мінімум, у 60 тыс. га, у тым ліку: саўгасы—3 тыс., калгасы—47 тыс. і аднаасобнікі—10 тыс. га. Даручыць бюро ЦК КП(б)Б у пяцідзённы тэрмін разгледзець і ўдакладніць плян азімай сяўбы ў раённым разрэзе, разгледжаны на сэкцыі пленуму.

Устанавіць тэрмін сяўбы азімых—15 дзён, пачаўшы сяўбу па ўсіх раёнах БССР з 20 жніўня з тым, каб скончыць яе ні ў якім выпадку не пазьней 5 верасьня.

2. Плян уздыму зяблева зацьвердзіць 1.127 тыс. га. Плян уздыму зяблева павінен быць выкананы поўнасьцю не пазьней 10 кастрычніка г. г. Напомніць усім РК і РВК аб тым, што дрэнная работа па ўздыме зяблева ў мінулым годзе мела выключна дрэнны ўплыў на пасьпяховы ход веснавой сяўбы і ў некаторых раёнах прывяла да невыкананьня пляну сяўбы. Пленум абавязвае ўсе РК, палітаддзелы і РВК аддаць выключную ўвагу гэтаму важнейшаму пытаньню і бязумоўна забясьпечыць поўнае выкананьне пляну зяблева і гэтым забясьпечыць умовы далейшага ўздыму ўраджайнасьці і больш пасьпяховага выкананьня пляну веснавой сяўбы 1934 г.

3. Даручыць бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР у дзённы тэрмін распрацаваць

Аб падрыхтоўцы да правядзеньня ўборкі, апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель

БССР, пасьлядоўна праводзячы ў жыцьцё рашэньні партыі, у 1933 г. дабіўся значных посьпехаў у сяўбе ільну: сяўба закончана на 12 дзён раней мінулага году пры значна больш высокай якасьці апрацоўкі зямлі і больш шырокім ужываньні агратэхнічных мерапрыемстваў, упяршыню засеяна 6.900 га гатункавага ільну і больш 1.000 га звышраньняга ільну.

Аднак, пленум ЦК і ЦККК папярэджвае супроць нявартай бальшавіцкай перацэнкі гэтых посьпехаў і самазадаволенасьці. Гэта вясна яшчэ ня стала да канца пераломнай у сэнсе адносін да ільну, як да адзнай з вядучых культур у распубліцы. У рабоце партыйных, савецкіх, зямельных і камсамольскіх арганізацый, МТС яшчэ не аддаецца неабходнай увагі культуры ільну і канапель і, у першую чаргу, у ільнаводчых раёнах.

Выключна ганебныя ўрокі мінулага году па дагледзе апрацоўцы і загатоўках ільну ня ўлічаны ўсімі арганізацыямі. Толькі гэтым можам вытлумачыць тое, што пасеў ільну расьцягнут на 40 дзён, засеяна ў раньнія тэрміны толькі 30,5 проц. пляну, рад раёнаў сарвалі выкананьне пляну пасеву ільну і канапель (Гарадоцкі, Бешанковіцкі, Сіроцінскі, Дрысьвянскі, Пухавіцкі, Расонскі, Клічаўскі і інш.). Келска арганізавана работа ў калгасах ільнаводчых раёнаў і, у першую чаргу, не замацавана роля і значэньне пастаянных вытворчых брыгад. Зусім мала ўцяпкуты жанчыны-калгасьніцы ў калгасную работу.

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б адзначае зусім нездавальняючы ход праполкі ільну і канапель і лічыць абсалютна неацярпімым у далейшым становішча падрыхтоўкі да ўборкі, апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель.

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б патрабуе ад усіх партыйных, савецкіх і зямельных арганізацый сапраўды бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пасеўшчыкамі сваіх абавязацельстваў па кантрактацыйных дагаварох у часе праполкі, уборкі, апрацоўкі і здачы прадукцыі ільну і канапель ураджаю 1933 г., праводзячы гэта на аснове бязьлітаснай барацьбы з кулацкім сабатажам, далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, правільнай арганізацыі працы (узмацненьне пастаяннай калгаснай брыгады, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўніўкі на аснове зьдзельшчыны, правільная расстаноўка сіл унутры брыгады пры правядзеньні ўборкі, апрацоўкі і здачы ўраджаю), поўнага і правільнага скарыстаньня машын (ільнацерабілак, малатарань і інш.), шляхам выкананьня ўсіх агратэхнічных правіл і максымальнай ліквідацыі страт у поўнай адпаведнасьці з дагаварамі па кантрактацыі.

ПЛЕНУМ ЦК І ЦККК КП(б)Б ПАДКРЭСЬЛІВАЕ, ШТО БССР МАЕ ЎСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ, КАБ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАЦЬ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ УСТАНОЎЛЕНУЮ ПЛЯНАМ СЯРЭДНЮЮ ЎРАДЖАЙНАСЬЦЬ—2,4 ЦНТН. ІЛЬНАВАЛАКНА, ДАВОЛЬНАЮЧЫСЯ ЯКАСЬЦЮ ЛІ ЦЫКЛІ ДАСЛЕДАЎ НУМАР СЯРЭДНІМ ПА РЭСПУБЛІЦЫ МЕНШ 2,5 ЦНТН. ПРЫЧЫНЫ Я РАЗГЛЯДУШЫ НА МЕСЦЫ ПАМЕ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ ТЭРМІН ЧЫ (ПРОДАЖУ) ПРАДУКЦЫІ ЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ ДЗЯРЖАВЕ.

У МЭТАХ ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПРАПОЛАЧНАЙ, УБОРАЧНАЙ І ЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІЙ ПЛЕНУМ ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Правесьці двухразовую праполку звычайнага ільну і трохразовую праполку гатункованага ільну. Абавязаць Белільнатрактарацэтр прыстасаваць і поўнасьцю скарыстаць папольнікі для прапашкі гатункованага ільну.

2. Правесьці цераблёньне звычайнага ільну ў раньняй жоўтай сьпеласьці, а гатункованага ільну—пры жоўтай сьпеласьці; выбаркі ўсёй пасконі—да канца цьвіценьня, а ўборку канапель—у стадыі васковай сьпеласьці насеньня ў сярэдняй частцы галовак.

У эьмену ўсіх раней быўшых пастаноў, скараціць тэрмін цераблёньня ільну, скончыўшы яго за 8-10 рабочых дзён. Цераблёньне кожнага вучастку праводзіць па меры высьпяваньня, не чакаючы пасьпяваньня ўсяго пасеву.

Адказнасьць за правільнае вызначэньне сьпеласьці і своячасовы пачатак уборкі ільну і канапель усклясьці па калгасах—на брыгадзіраў і старшынь праўленьняў калгасаў, па аднаасобным сэктарах—на ўпаўнаважаных 10-цідворак, членаў сельсаветаў, для чаго ўстанавіць пастаянны нагляд за ходам пасьпяваньня ільну і канапель.

Абавязаць Наркамзем і Трактарацэнтры на працягу 2 дзённага тэрміну спусьціць раёнам пляны ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель з тым, каб раёны не пазьней, як праз тры дні пасьля атрыманьня пляну з цэнтру, склалі раённыя пляны ўборкі з улікам тэрмінаў засеву ў разрэзе кожнага сельсавету і калгасу.

3. Забясьпечыць поўнае і правільнае скарыстаньне ільнацерабілак і іншых машын па ўборцы і апрацоўцы тэхнічных культур (у прыватнасьці, машын Гільштэйна і «Эддзі» па ачосе ільну). Распрацаваць нормы выпрацоўкі на машынах і забясьпечыць напежны выбар плошчаў, годных для ўборкі машынамі.

Абавязаць райкомы ўстанавіць прымацаваньне да кожнай машыны камуністаў і камсамольцаў, якія павінны за бясьпечыць поўную нагрузку машын і іх правільнае скарыстоўваньне.

Цераблёньне гатункованага ільну рабіць ручным спосабам. Абавязаць Наркамзем, Трактарацэнтры і РК КП(б)Б правесьці адбор і дадатковую падрыхтоўку ільнацерабільшчыкаў з ліку лепшых калгаснікаў-ударнікаў з такім разьлікам, каб да 1-га жніўня 1933 году забясьпечыць падрыхтоўку наступных кадраў:

Па ільнатрактарацэнтру—ільнацерабільшчыкаў для работы на ільнацерабілцы «Камсамолка»—2.400 чал., і на шырокахватнай ільнацерабілцы — 225 чал., брыгадзіраў ільнацерабільшчыкаў —340 чалавек.

Па Бульбатрактарацэнтры—ільнацерабільшчыкаў—300 чал., і па Збожжатрактарацэнтры —ільнацерабільшчыкаў —100 чал.

Абавязаць Наркамзем і трактарацэнтры забясьпечыць поўны ў вызначаны тэрмін рамонт і своячасовую перавідку ільнацерабілак, а таксама правядзеньне на месцы перад пачаткам работы правільнага іх рэгуляваньня і ўстаноўкі.

4. Правесьці ў калгасах апрабацыю, абсьледаваньне і адбор гатункових і лепшых па якасьці вучасткаў ад звычайнага ільну і канапель. Абавязаць Наркамзем распрацаваць інструкцыю аб парадку правядзеньня апрабацыі і адбору. Абавязаць райза, МТС, праўленьні калгасаў, забясьпечыць асобную ўборку, абмалот, апрацоўку і захаваньне адабранага апрабацыяй насеньня ільну і канапель.

5. Абавязаць Белільнатрактарацэнтр і РВК не пазьней 1-га жніўня 1933 году скончыць арганізацыю пры МТС і будаўніцтва дзьвёх новых ільнанасенных баз для гатункованага насеньня ільну ў Горацкім і Лёзьнянскім раёнах, а таксама падрыхтаваць пляц насенных баз пры МТС на іншых раёнах, якія маюць пасевы гатункованага ільну.

6. Абмалот прасушанага ільну праводзіць праз 5—7 дзён пасьля цераблёньня, поўнасьцю скарыстаўшы ўсе лепшыя спосабы натуральнай сушкі (паветраная сушка ў шатрох, конусах і г. д.), якія забясьпечваюць правядзеньне абмалоту і вчосу ў вызначаныя тэрміны.

Забараніць абмалот ільну на абожжавых малатарнях. Зараз-жа пасьля абмалоту правесьці расьціп і замочку саломы ільну і канапель, забараніўшы пакіданьне саломы ільну і канапель для зімовага і веснавога расьціпу.

Забараніць расьціп і замочку неабмалочанага ільну і канапель.

7. Правесьці дакладны ўлік, вдбор і падрыхтоўку лепшых сьцеліішчаў, не дапускаючы скарыстаньня для расьціпу вучасткаў, якія вызначаны для засеву ільну ў наступным годзе.

Абавязаць Наркамзем, трактарацэнтры, РВК і РК КП(б)Б забясьпечыць скончэньне ў вызначаныя тэрміны будаўніцтва, рамонт мачыльных ям і мяльна-сушыльных пунктаў, а таксама падрыхтоўку для мочкі натуральных вадаёмаў.

8. Улічваючы значэньне сартаваньня для атрыманьня лепшай якасьці трасты і валакна, правесьці:

а) асобнае цераблёньне розных па якасьці саломкі вучасткаў ільну і канапель з далейшай асобнай апрацоўкай ураджаю гэтых вучасткаў;

б) снаповае сартаваньне ільну перад абмалотам;

в) сартаваньне трасты пасьля падзёму са сьцеліішчаў, або выемкі з мачыльняў і сушылак;

г) сартаваньне валакна пасьля трапаньня.

Для правядзеньня сартаваньня саломы, трасты і валакна выпучыць у кожнай брыгадзе найбольш вопытных калгаснікаў і калгасьніц. Абавязаць т. т. Вайновіча (Загатлён) і Селіванава (Белільнатрактарацэнтр) на час расьціпу (мочкі) і арганізацыі мяцьцё і трапаньня мабілізаваць са свайго апарату спэцыялістаў у дапамогу найбольш буйным калгасам.

9. Правесьці ў мачыльных раёнах абавязковую мочку палепшаным спосабам (пскоўскім) ня менш 30 проц. усёй саломы ільну, якая падлягае мочцы.

10. Пленум лічыць абсалютна нездавальняючым становішча апарату Загатільну зьверху да нізу: апарат не пера будаваны і зусім не падрыхтаваны да загатоўчай кампаніі і значна ў радзе зьвеньняў засьмечан чужым элемэнтам.

Пленум абавязвае Загатлён, пад пэрсанальную адказнасьць тав. Вайновіча, [illegible] арганізацыі, [illegible] меры [illegible] перабоўкі [illegible] Загатільну, [illegible] пе [illegible] у [illegible] і [illegible] ў поўнасьцю з [illegible]

Пленум лічыць неабходным правесьці выдзяленьне групы калгаснікаў-ударнікаў для работы на прыёмачных пунктах.

Абавязаць Загатлён—тав. Вайновіча і райкомы КП(б)Б забясьпечыць скончэньне рамонту і пабудовы прыёмачных баз і складаў па ільну і ільнанасеньні не пазьней 1-га жніўня, укамплектаваўшы прыёмачныя пункты напежным штатам прыёмшчыкаў і сартоўшчыкаў, забясьпечыўшы адпаведнымі квітанцыямі і інш.

Пленум зварачае ўвагу Загатільну і РК КП(б)Б на неабходнасьць устанаўленьня самага ўважлівага культурна-бытавога абслугоўваньня ільназдатчыкаў (абстаўляньне чайных, чытальнь і г. д.).

11. Абавязаць Наркамзем і Белільнатрактарацэнтр закончыць рамонт ільнапеньказаводаў не пазьней 15 верасьня, да гэтага тэрміну правесьці ачыстку заводзкіх двароў ад сьмецьця і астатнюю нягоднай трасты мінулых гадоў. Забясьпечыць ачыстку і рамонт шох, загатоўку сьцелажоў і ўкамплектаваць прыёмачны апарат заводаў выстарчальнай колькасьцю работнікаў па прыёмцы трасты.

Закончыць перапрацоўку трасты ўраджаю 1932 году да паступленьня новай трасты, але не пазьней 15 верасьня.

12. Абавязаць Загатлён, упаўкамзаг СНК і НКЗ правесьці распрацоўку і ўстанаўленьне стандартаў саломы: пянькі і ільну, а таксама трасты не пазьней 25 жніўня і валакна не пазьней 5 верасьня—па ільну і 1 кастрычніка—па пяньцы, забясьпечыўшы поўнае азнаямленьне з устаноўленымі стандартамі ўсіх здатчыкаў і давядзеньне стандарту да больш буйных калгасаў.

Абавязаць упаўкамзаг СНК, Загатлён, Белільнатрактарацэнтр і РВК устанавіць асаблівы кантроль за якасьцю паступаючай на заводы трасты, рашуча дабіваючыся павялічэньня выхаду доўгага валакна з турбіннага сырцу, поўнасьцю забараніўшы прыёмку трасты і саломы, не адпавядаючай умовам кантрактацыйных дагавароў.

Устанавіць, як правіла, першачарговы адбор з ураджаю лепшай трасты і саломы для здачы на заводы, згодна кантрактацыйных дагавароў.

13. Пленум прапануе Наркамзему і трактарацэнтрам унесьці не пазьней 1 жніўня 1933 г. на зацьвярджэньне СНК сетку ільнамяльнасушыльных пунктаў, распрацаваць і давесьці да раёнаў каляндарны плян па-за заводзкай апрацоўкі ільну і канапель з тым, каб да кожнага мяльна-сушыльнага пункту былі прымацаваны калгасы і аднаасобныя гаспадаркі, якія будуць праводзіць па-за заводзкую апрацоўку ільну і канапель, выходзячы з неабходнасьці забясьпячэньня абавязковай здачы ў тэрмін прадукцыі ільну і канапель.

14. Даручыць ЦК і СНК устанавіць канчатковыя тэрміны выкананьня пляну заготовак ільну і канапель і неадкладне даць іх раёнам. Бюро ЦК удакладніць пляны здач

Партыйнае будаўніцтва

Важнейшай задачай партыйных арганізацый зьяўляецца такое замацаваньне рэзультатаў чысткі як у кожнай асобнай ячэйцы, так і ў партыйнай арганізацыі ў цэлым. Якое забясьпечыла-б карэнную перабудову ўсёй партыйнай работы

З пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Канкрэтнай работай па перабудове партыйнай работы на вёсцы—замацаваць вынікі чысткі

Старобінская партыйная арганізацыя прышла да чысткі з поўным выкананьнем пляну сяўбы, а таксама з нядрэннымі паказальнікамі па іншых гаспадарча-палітычных кампаніях (здача мяса і інш.).

Праверка работы асобных парт'ячэек і камуністаў паказала, што арганізацыя побач з посьпехамі, якімі яна можа ганарыцца, мае і рад сур'ёзьнейшых недахопаў. Значны процант выключаных—24 проц. з 120 праверэных камуністаў гаворыць за тое, што партыйная арганізацыя, у асаблівасьці асобныя ячэйкі, як Пруская, Чапляеўская былі выстарчальнай барацьбы за лінію радоў нашай партыі.

Пры чыстцы з дапамогай беспартыйных калгаснікаў выяўлены такія людзі, як кандыдат партыі **Дашкевіч**, які да ўступленьня ў калгас систематычна трымаў наймовую рабочую сілу, або кандыдат партыі **Барончык Сідар**, у адносінах якога толькі на сходзе ўдалося ўстанавіць, што ён у перыяд беларускай акупацыі быў польскім солтысам і дэзэртыраваў з радоў РСЧА.

Аналіз прычын выключэньняў паказвае, што амаль палова выключэньняў—41 проц. — падае на асоб, якія ў тэй або іншай ступені арасьліся з кулакамі, актыўна абараняюць кулакоў, або-ж прымірэнча адносяцца да шкодніцкай работы клясавага ворага. Характэрным прыкладам у гэтых адносінах зьяўляецца **Пруская ячэйка**.

Пруская ячэйка, якая налічвае ў сваім складзе 12 чалавек і абслугоўвае 4 калгасы, вышла здавальняюча з выкананьнем пляну веснавой сяўбы толькі дзякуючы таму, што ў яе раёне пастаянна сядзелі некалькі ўпаўнаважаных РК, якія націскалі на членаў ячэйкі.

Да часу чысткі ў гэтых калгасах плян уезьняцця папараў быў выкананы толькі на 25 проц., праполка ільну на 50 проц. і г. д. Калгасы аказаліся засьмечанымі чужымі элемэнтамі, прычым апошнім удалося прабрацца на пасады загадчыкаў фэрмаў, брыгадзіраў, рахункаводаў («Чыр. Пуцілавец»). Чыстка ячэйкі паказала, што ўсе гэтыя зьяўішчы вынікалі з таго, што ў самой ячэйцы мелася група кулакоў, як **Дашкевіч**, або зьвязаных з кулаком, як заг. вучастку МТС **Холад**.

Характэрна, што факты сувязі Холада з кулакамі, паручэльствуў, даваемых ім кулакам для ўступленьня ў партыю, дэзэртырства яго з радоў РСЧА былі ўскрытыя не на сходзе, тут камісія сустрэлася з наўпечнай круговой парукай з боку камуністаў. Беспартыйныя калгаснікі баяліся выступаць на сходзе і толькі шляхам заяў у камісію дапамаглі выкрыць сапраўдны твар кулацкага агента Холада. А сакратар ячэйкі, настаўнік **Сакалоўскі**, замест таго, каб ачысьціць ячэйку ад кулацкіх падпявалаў, мабілізаваць яе на барацьбу за ачыстку калгасаў і правядзеньне чартовых кампаній, сам папаў пад уплыў Холада і яму падобных. Сакалоўскі страціў клясавы твар, зьвязаўся з кулакамі на глебе бытавога разлажэньня і нават стаў даваць дырэктывы аб адчаўленьні кулакоў у калгасе. Амаль па лова членаў Прускай ячэйкі выключана камісіяй з партыі.

Але побач з такімі ячэйкамі як Пруская, ёсьць ячэйкі, якія паказваюць прыклад добрага кіраўніцтва калгасам.

Парт'ячэйка калгасу **«Новы быт»** правільнай расстаноўкай партыйных сіл, канкрэтным кіраўніцтвам дабілася таго, што калгас аздаравіў сьвінафэрму, сяўбу выкаваў поўнасьцю і датэрмінова, сенакашэньне закончыў. Калгас поўнасьцю гатоў да ўборкі. У ячэйцы ёсьць рад партыйцаў, якія даюць прыклады работы на вытворчасьці: **Кадроў, Доміна, Сьцяпурка** і інш.

Чыстка па раёну праходзіць пры вялікай актыўнасьці беспартыйных, у сярэднім на сходзе прысутнічала 100-200 чалавек. Беспартыйныя калгасьнікі на сходах актыўна дапамагалі камісіі ў выяўленьні асоб, нядатых быць у радах партыі, актыўна абгаварвалі станоўчыя і адмоўныя бакі работы партыйных ячэек. Не абышлося і без спроб клясавага ворага выкарыстаць чыстку для кампрамэтацыі добрых бальшавікоў. Так было ў Пагосцкай ячэйцы, дзе кулакі арганізавалі выступленьне бяднячкі-калгаснікі супроць члена партыі, старшыні калгасу Новіка з радам абвінавачаньняў, якія пры праверцы не пацьвердзіліся.

Трэба адзначыць, што камсамол пры мае ў чыстцы надзвычай слабы ўдзел. Пры праверцы 12 парт'ячэек, якія ахопліваюць сваім кіраўніцтвам 25 камсамольскіх ячэек з колькасьцю камсамольцаў да 250 чал., на сходах па чыстцы прысутнічала ня больш 55 проц. усіх камсамольцаў, а выступала толькі 12 чалавек, у той час, калі беспартыйных калгаснікаў і рабочых выступала больш 200 чал.

Якія асноўныя недахопы ўскрыты чысткай у рабоце райпартарганізацыі?

Па-першае, слабасьць масавай работы ячэек сярод беспартыйных. Работа ідзе ад кампаніі да кампаніі, уліку беспартыйнага актыву і работы з ім няма, сацыпаборніцтва і ўдарніцтва, за выключэньнем некалькіх калгасаў («Новы быт» і інш.) а таксама саўгасу Пагост, не разгорнута.

Другі сур'ёзьнейшы недахоп—гэта пастаноўка работы партыйнай асьветы. У гэтым годзе гэту справу і РК і ячэйкі фактычна правалілі і толькі перад самой чысткай паспрабавалі насьпех навярстаць на працягу тыдня ўпушчанае за месяцы. У рэзультаце палітычны ўзровень камуністаў і асабліва кандыдатаў партыі (з апошнімі ніякай работы не вядзецца) надзвычай нізкі. Камісіі прышлося сустрэцца з фактамі, калі 50 проц. праверэных камуністаў ня чытала газэт і нават сакратары ячэек (Пагост, «Ударнік», Чыжэвічы) ня ведаюць важнейшых пастаноў партыі па сельскай гаспадарцы, не арыентуюцца ў палітыцы партыі ў вёсцы. Рад членаў і кандыдатаў партыі ў саўгасе Пагост ня толькі палітычна неграмотныя, але нават ня ўмеюць падпісацца.

Работа сярод жанчын у большасьці ячэек фактычна не вядзецца, дэлегацкія сходы не працуюць, жанчыны не ахоплены партыйнай асьветай; між тым, ёсьць факты масавага незадаволенасьці жанчын на работу ў разгар сенакашэньня ня ў дні рэлігійнага сьвята (нядзеля) —факт гэты меў месца ў Чырвона-Дворскім сельсавеце.

Да сур'ёзьнейшых недахопаў партыйнай работы трэба аднесьці тое, што ні ў адзнай з праверэных ячэек ня было пляну работы, работа ідзе ад выпадку да выпадку, ад кампаніі да кампаніі, а райком КП(б)Б, ня гледзячы на тое, што яго прадстаўнікі часта бываюць у ячэйках, ня выправіў гэтага палажэньня.

Партыйная арганізацыя Старобінчыны не зьвярнула належнай увагі на пытаньні размяшчэньня жывёлагадоўлі ў раёне і на стан калгасных сьвінафэрм. У часе чысткі выяўлены факты атэйнейшага становішча ў радзе калгасаў са сьвінафэрмамі. З прычыны засьмечанасьці складу работнікаў сьвінафэрм, нядобрасумленных адносін да работы, падзеж маладняка ў асобных калгасах дашоў да 40-50 проц. (калгас «Перадавік», «Шлях да сацыялізму», «Чырвоны Пуцілавец»). І наадварот, там, дзе партыйная ячэйка ўважліва аднеслася да гэтай справы, вычысьціла склад работнікаў фэрм ад чужога элемэнта (Міцяевічы), там падзеж не перавышае 7 шт. на 400 галоў.

Праведзеная ў час чысткі работа, ачыстка ячэек ад усяго небальшавіцкага і актывізацыя беспартыйных мас ужо дае адчувальныя рэзультаты ў выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній. **Па ячэйках, прашоўшых чыстку, выкананы плян праполкі, акучваньня бульбы, сенакашэньня на 21-VII на 69 проц.** Значна палепшылася партыйная работа ў перабудаваных паводле дырэктывы ЦК УсеКП(б) калгасных ячэйках.

Партарганізацыя павінна замацаваць гэты ўздым, каб яшчэ больш мабілізаючы калгасныя масы, правесьці дабальшавіцку ўборку, якая пачынаецца, і арганізаваць датэрміновую паставку збожжа дзяржаве.

Старшыня Старобінскай раённай камісіі па чыстцы

тав. АБЭРФЭЛЬД.

Ход чысткі КП(б)Б

Па 29 раёнах Беларусі на 25 ліпеня праверэны 9.873 члены партыі, 4.911 кандыдатаў. Выключана членаў партыі 1.596, кандыдатаў — 1.138. Пераведзена з членаў партыі ў кандыдаты 1.220, з членаў партыі ў спачуваючыя — 44 чал., з кандыдатаў у спачуваючыя — 1.077 чал.

Большасьцю выключаных членаў партыі зьяўляюцца: былыя буржуі, эсэры і трацкісты, якія на працягу доўгага часу, знаходзячыся ў радах партыі, канчаткова не парвалі сувязі з мінулым, не апраўдалі сябе ў практычнай рабоце. Таксама выключан рад клясава-варожых элемэнтаў, якія пры ўступленьні ў партыю ўтаілі свой твар: былыя спэкулянты, дэзэртыры, бандыты і інш. Напрыклад, член партыі Хэйфэц (віцебская панчошная фабрыка) да 1928 году займалася спэкуляцыяй, была пазбаўлена выбарчых правоў, але, выйшаўшы трапіўшы на прадпрыемства, уступіла ў партыю, утаіўшы сваё мінулае.

Апрача таго, выключана шмат перараджэнцаў і разлажыўшыхся членаў партыі: рвачоў, бракаробаў, гультаёў, якія, знаходзячыся ў партыі, сваімі паводзінамі кампрамэтавалі яе.

(Белта).

Аб разглядзе матар'ялаў і апэляцый па чыстцы вясковых ячэек Менскага раёну

Пастанова Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы

У мэтах мабілізацыі ўвагі ўсёй партарганізацыі на пасьпяховае правядзень не ўборачнай і загатоўчай кампаніі, Менская гарадзкая камісія па чыстцы партыі пастанаўляе:

1. Лічыць немагчымым у цяперашні момант адрываць партыйцаў вясковай партыйнай арганізацыі і ўсіх партыйцаў, мабілізаваных на работу ў вёсцы, ад іх непасрэднай работы па правядзеньні ўборачнай і загатоўчай кампаніі.

Адкласьці зацьвярджэньне вынікаў і прапаноў ячэйковых камісій па чыстцы вясковай партарганізацыі, а таксама разгляд пэрсанальных апэляцый — да скончэньня ўборачнай і загатоўчай кампаніі.

2. Папярэдзіць усіх партыйных і гаспадарчых работнікаў вясковай партарганізацыі і ўсіх партыйцаў, у тым ліку і выключаных ячэйковымі камісіямі з партыі і апэлюючых у гарадзкую камісію, што работа кіраўнікоў і парт'ячэек у цэлым, а таксама і кожнага партыйца ў паасобку будзе разглядацца ў залежнасьці ад іх канкрэтнага ўдзелу ў рабоце, якая зараз праводзіцца партыяй на вёсцы.

3. Абавязаць усе камісіі, якія праводзілі чыстку вясковых ячэек, устанавіць пастаянны нагляд за работай партыйных ячэек і партыйцаў і ў адпаведнасьці з удзелам апошніх ва ўборачнай і загатоўчай кампаніі ўносіць адпаведныя карэктывы ў вынікі аб рабоце ячэйкі ў цэлым, кіраўнікоў парт'ячэек, стершынь калгасаў, дырэктароў МТС і саўгасаў, а таксама аб рабоце пэрсанальна кожнага партыйца ў паасобку.

Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б

У сувязі з хваравітым станам тав. Серпеня вызваліць яго ад работы па чыстцы ў Старобінскім раёне, пакінуўшы для работы па чыстцы па Менску.

Замест тав. Серпеня зацьвердзіць членам раённай камісіі па чыстцы Старобінскай партарганізацыі тав. Адлерштэйна Б. І., — член партыі з 1917 году, рабочы, пам. пракурора Вярхоўнага суда БССР.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Ад рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б

У сувязі з тым, што многія таварышы, якія падалі апэляцыі ў Рэспубліканскую камісію па чыстцы, выяжджаюць у Менск па пытаньні разгляду іх апэляцый бяз выкліку і ў дні, калі апэляцыі ня могуць быць разглядзены, паведамляецца, што аб часе разгляду апэляцый кожнаму апэлюючаму будзе паведамляцца пэрсанальна лістом, а таксама праз зьмяшчэньне публікацый у газэце «Зьвязда». Бяз гэтых выклікаў, каб унікнуць непатрэбных паездак у Менск па апэляцыях, выяжджаць ня варта.

За хутчэйшую рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК аб чыгуначным транспарце

Магілеўскі вузел перабудову правёў толькі фармальна

Магілеўскі чыгуначны вузел зьяўляецца адным з буйнейшых у Жлобінскім раёне. Вузел мае дэпо, службы шляху, руху і інш. Вузел мае таксама даволі вялікую партыйную арганізацыю. Толькі ў адным паравозным дэпо партыйны калектыў налічвае 150 чалавек. Здавалася-б, што тут перабудова работы на аснове пастаноў СНК і ЦК павінна была быць праведзена найбольш хутка і па-дзелавому. Між тым, факты паказваюць процілегчае.

Праўда, у справаздачах, у дакладных, у тэлеграмах паведамляецца, што перабудова скончана, адпак, гэта толькі з фармальнага боку. Фармальна ліквідавалі тыя службы, якія ўказаны ў пастанове СНК і ЦК, але за працу не ўзяліся, усё чакаюць нейкіх указаньняў з дырэкцыі дарогі. Стары метад — чакаць дырэктыў зьверху, не рабіць нічога без загаду, без цыркуляру — яшчэ жыве на Магілеўскім вузле.

Як-жа выглядае сапраўдная перабудова?

Паводле пастановы СНК і ЦК паравозное дэпо павінна вылучыць вагонную гаспадарку ў асобную адзінку. Фармальна гэта работа праведзена. Паміж начальнікам паравознага дэпо Герашчанка і начальнікам вагоннай часткі Кавалеўскім заключан дагавор аб вылучэньні вагоннай гаспадаркі у асобную адзінку да 25 ліпеня. Вагонная частка павінна атрымаць патрэбную ёй колькасьць рабочых, варштатаў і інструментаў. Але гэта толькі ў дагаворы, на справе начальнік дэпо Герашчанка перадаў вагоннай частцы толькі 25 проц. рабочых, якія працавалі па рамонту вагонаў. Наогул вагоннае дэпо фактычна яшчэ не працуе, як хворых вагонаў штодзенна павялічваецца, а чыноўнікі Герашчанка і Кавалеўскі ня спыняюць спрэчак паміж сабой.

Не праведзена перабудова работы і ў самім паравозным дэпо. Большасьць перакінутых сюды работнікаў адміністрацыя адпусьціла ў адначнак. Да гэтага часу ня створаны атэстацыйна-іспытныя камісіі. Зусім нізкая працыцыпліна. Ня зьнічтожаны арывы спаранай. Качагар **Нэйман** за апошнія 10 дзён два разы сарваў спаранную язду, між тым нізкіх мер супроць гэтага ні прафсаюзная арганізацыя, ні адміністрацыя ня прынялі.

Ня лепш справа і ў матар'яльнай службе. Паравозы пад наборам аналу замест вызначаных 30-35 мінут прастойваюць па 4-5 гадзін. Начальнік **Пачакаў** проста займаецца «очковтирательством». Ён укрывае фактычны прастой, запісваючы толькі час, калі пачынаецца набор аналу. Каб уявіць размеры прастояў, даволі сказаць, што толькі за апошнія 10 дзён дэпо выплаціла машыністам за прастої пад наборам аналу 5.000 рублёў.

Значныя недахопы ў рабоце мае таксама служба руху. Лічыцца пібыта яна выконвае трафіфікацыю на 120 проц., на справе-ж праверка паказала, што ні адзін вымяральнік ня выконваецца. (Замест нормы 5,5 гадзін прастой паравозаў складае 5,6. Тое-ж самае і з іншымі паказальнікамі). Тут праведзен пераглед норм. Замест 168 застаўлена 4, але правялі гэта цяпер вільна, ні да адной работы нельга гэтыя нормы прыстасаваць, яны вісяць на простай урэгулёўцы. Тое-ж самае і ў паравозным дэпо. Перагледжаныя нормы тэхнічна не абгрунтаваны.

Усё гэта здарылася таму, што гаспадарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі фармальна падышлі да перабудовы работы. Асабліва бязьдзейнічаюць прафсаюзныя арганізацыі. У радзе зьвеньняў не арганізаваны нават прафгрупы, ня выбраны прафупаўнаважаныя. У вагоннай гаспадарцы няма мясцкому. Рабочы савет прафсаюзу літаральна палец аб палец ня ўдарыў, каб дапамагчы чыгуначнай прафарганізацыі перабудаваць. За ўвесь час райпрафсавет не накіраваў на чыгунку ні однога свайго прадстаўніка.

Магілеўскі вузел, як і ўвесь чыгуначны транспарт, уступае ў самы адказны перыяд сваёй работы. Вузел будзе прапускаць штодзенна звыш 180 саставаў усякіх грузаў. 85 вагонаў павінны кожны дзень грузіцца ў самім Магілеве. Гэта ставіць перад партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі, перад адміністрацыяй адказьнейшую задачу — забясьпечыць поўнае выкананьне пляну перавозак. Для гэтага раней за ўсё трэба зламаць сабатаж перабудовы, адчысьціць апарат ад сабатажнікаў, якія супраціўляюцца гэтай перабудове, па-бальшавіцку рэалізаваць пастановы СНК і ЦК аб чыгуначным транспарце.

РК КП(б)Б павінен выканаць пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб дапамозе чыгуначным арганізацыям у перабудове.

Н.

Падарунак рабочых заводу імя Ланцуцкага

ГОМЕЛЬ, 2. (Наш кар.).

Стройны распарадак штодзённай працы каля варштату парушан кароткім перапынкам. Тысячы змагароў за добры вагон і паравоз — рабочых і работніц чырвонасьцяжнага заводу імя Ланцуцкага рушылі з карпусоў і разьмясьціліся тут-жа, на невялікай пляцоўцы пад абапяной сеткі чыгункі.

Аглушаючы сьвісток прарэзаў паветра. Пад гукі духавога аркестру, з шырокіх, насьцяж расчыненых варот вагонабудаўнічага цэху павольна выходзіць, зьяючы бляскам, паравоз Н-В-91 з двума квітнеючымі чырванню пасажырскімі вагонамі.

Гэта — зьвышпляновы выпуск калектыву заводу ў гонар чысткі партыі і ў адказ на пастанову СНК і ЦК аб транспарце.

Гэты падарунак сёньня ўрачыста перададзена краіне.

Адкрыўшы мітынг, старшыня заўкому тав. **Журомскі** дае першае слова старэйшаму рабочаму, лепшаму ўдарніку тав. **Сільківічу.**

— Наш сёньняшні скромны падарунак краіне, — гаворыць тав. Сільківіч, — сьведчыць аб адданасьці рабочых і бламежнае давер'е свайму авангарду—камуністычнай партыі і улюбёнаму правадыру тав. Сталіну. Гэта — доказ энтузіязму рабочых мас, магчымага толькі ў краіне сацыялістычнага будаўніцтва, дзе праца зьяўляецца справай славы, гонару і геройства.

Горача вітае рабочых чырвонасьцяжнага заводу сакратар гаркому тав. **ШАФАРЭНКА.**

— Наша партыя, праводзячы зараз чыстку, працуе над тым, над чым працаваў 2-гі зьезд трыццаць год таму назад, які мы зараз адзначаем, — над умацаваньнем адзінства і маналітнасьці радоў партыі, каб з посьпехам весьці рабочую клясу да новых перамог. Вы правільна ўсьвядомілі вялізарнейшае значэньне чысткі. Дапамагаючы партыйнаму калектыву ў правядзеньні чысткі, вы гэту работу спалучаеце з узьняцьцем тэмпаў і якасьці на вытворчасьці. Ваша ініцыятыва выпуску ў гонар чысткі паравоза і двух вагонаў звышпляну — бліскучы ўзор для ўсіх працаўнікоў Гомельшчыны.

Ад імя ЦК КП(б)Б, ЦКСБ вітаў рабочых старшыня раённай камісіі па чыстцы тав. **Кавальчук.** Ад імя ЦК чыгуначнікаў выступіла тав. **Міхайлоўская.**

— Наш завод — гаворыць дырэктар тав. **Сімакоў**, — ня ведае прарываў. На працягу першай пяцігодкі мы давалі штогодна ня менш 100 проц.

Лёзунг перадавікоў заводу — даць звышпляну паравоз і два вагоны — ударным парадкам ператворыць у дзейсьнасьць не толькі дзякуючы вялікай актыўнасьці і энтузіязму рабочых мас. У гэтым зарука нашых далейшых посьпехаў.

Мітынг скончыўся. Машыніст даў сьвісток. Гудок паравоза гучэў аб новых перамогах калектыву чырвонасьцяжнага заводу. Рабочыя з захапленьнем глядзелі на адыходзячы цяпік, любаваліся вынікамі сваёй ударнай работы.

Я. ІВАШЫН.

З апошняй пошты

ШКОДНАЕ ЗАХАПЛЕНЬНЕ ГАЗЭТЫ „КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ"

«Калгасьнік Беларусі» на першай старонцы № 96 за 31 ліпеня з захапленьнем паведамляе:

«ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў ЗБОЖЖА ПАСТАЎКАХ

ЖЛОБІН. (Ад нашага кар.). Калгасы «Чырвоны Бор», «Вольная праца», «Чырвоная Радуша» і аднаасобнікі вёсак Радуша і Кругі, рыхтуючыся да чырвонага ўсебеларускага абозу, распачалі абмалот збожжа.

Па сельсавеце падрыхтавана каля 12 тон збожжа (падкрэсьлена нашы). Ідзе змаганьне за пяршынства, хто чырвоным абозам 1-га жніўня поўнасьцю выканае плян збожжапастаўкі дзяржаве.

М. Кручкоў».

Такім чынам, рэдакцыя «К. Б.» штампуе і ўхваляе на ўсю Беларусь у корані шкодную тэндэнцыю тармажэньня штодзённай збожжаздачы, накапленьня ў калгасах і аднаасобнікаў абмалочанага збожжа.

У пастанове апошняга аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б гаворыцца: «Вывазка збожжа на загатпункты павінна праводзіцца непасрэдна з-пад малатарні», прычым з мэтай бязупыннай вывазкі збожжа прапануецца выдзяленьне ў брыгадах спэцыяльных возчыкаў збожжа ў загатпункты. Рэдакцыя-ж «Калгасьніка Беларусі» ў пагоні за большай помпай і сьвяточнасьцю, забывае, якія будуць вынікі ад абрыву канвэера работ па ўборцы і збожжаздачы—паміж малатарняй і загатпунктам паўстае сьвірань калгасу і аднаасобніка (ужо падрыхтавана 12 тон!).

На тэй-жа першай старонцы таго-ж нумару «Калгасьнік Беларусі» ілюструе лёзунг «першы снап—дзяржаве» малюнкам, на якім паказана, як дзьве жанчыны нясуць на снапу. Няўжо рэдакцыя «К. Б.» думае, што дзяржаве павінна здавацца неабмалочанае збожжа ў снапох?

Для нас яна, што рэдакцыя газэты «Калгасьнік Беларусі» не зразумела сутнасьці бальшавіцкага лёзунгу: «З-пад малатарні — па загатпункт», фактычна прапагандуючы паўтарэньне памылак загатоўчай кампаніі мінулага году.

На ўсебеларускай радыё-нарадзе партыйнага і рэспубліканскага актыву

Вялізарныя посьпехі калгаснага будаўніцтва ў бягучым годзе зьявіліся рэзультатам рашучага палянпэньня кіраўніцтва калгасамі. Тав. **СТАЛІН** на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) указваў, што **«партыя, калі яна хоча кіраваць калгасным рухам, павінна ўваходзіць ва ўсе дэталі калгаснага жыцьця і калгаснай вытворчасьці».** Падрыхтоўка веснавой сяўбы і яе пасьпяховае правядзеньне гаворыць аб барацьбе за ажыцьцяўленьне гэтых указаньняў тав. **СТАЛІНА.** Іменна гэта акалічнасьць забясьпечыла нам новыя перамогі на фронце калгаснага будаўніцтва.

Адным з прыкладаў таго, як трэба канкрэтна кіраваць калгасным будаўніцтвам, можа служыць скліканьне ЦК КП(б)Б 29 ліпеня трэцяй на ліку за перыяд правядзеньня сельска-гаспадарчых работ **усебеларускай нарадзе-ліку партыйна-камсамольскага, калгаснага і сельсавецкага актыву.**

БССР уступіла ў паласу масавай уборкі і збожжаздачы, таму праводзіўшыя радыёнараду т. т. **ГІКАЛО** і **ЛЫЧОЎ** упор рабілі на праверку гатоўнасьці паасобных брыгад, калгасаў і сельсаветаў да гэтага адказнага перыяду сельска-гаспадарчых работ.

Слова апрымлівае **Рагачоў.** Ля мікрафону старшыня інтэрнацыянальнага калгасу **«Чырвоная армія» тав. Бэрнштэйн.** Ён расказвае аб росьце свайго калгасу, аб тым, як яны правялі веснавую сяўбу. У мінулым годзе сяўба збожжавых была скончана толькі 5 жніўня, а ў гэтым годзе збожжавыя культуры былі засеяны да 1-га мая. Ураджай збожжавых у 1932 годзе складаў 4,2 цнтн. з гэктару, а ў гэтым годзе мы будзем мець **ня менш 12 цнтн.** з га. Бульбы мы сабралі ў мінулым годзе 31,3 цнтн. з га, а ў гэтым годзе выбярэм **120 цнтн.**

— Раскажэце, як вы падрыхтаваліся да ўборкі?—задае пытаньне тав. **ЛЫЧОЎ.**

— Калгас праводзіць уборку па ўдарнаму—адказвае тав. **Бэрнштэйн.** Уборка сенажаляй ужо скончана, мы прыступілі да ўборкі збожжавых. Ужо скошана 4 га ячменю і 6 га жыта. **1 жніўня калгас адвязе ў Рагачоў чырвоны абоз з 20 цнтн. збожжа. Да 5 жніўня абавязаемся выканаць ня менш 75 проц. пляну збожжаластавак, а 10—дамо 100 проц.** Плян у нас 94 цнтн.

Далей тав. Бэрнштэйн расказвае аб настроях калгасьнікаў:

— У нас калгасьнік ведае, за што ён змагаецца. Ён добра ведае, сколькі збожжа і бульбы застанецца ў яго распарадкэньні пасьля выкананьня абавязкаў перад дзяржавай. Калі ў мінулым годзе ў нас на працадзень выпала толькі 600 грамаў збожжа, дык у гэтым годзе мы будзем мець па 4 кгр. Бульбы мы ў гэтым годзе атрымаем па 10 кгр. на працадзень.

Тав. **ЛЫЧОЎ:**—Ці гатовы ў вас усе машыны да ўборкі і абмалоту.

— Нас прамінулі снопавязалкай —гаворыць т. Бэрнштэйн. Яна зараз нам асабліва неабходна, адпак, вось ужо тры тыдні як мы маем нарад, але атрымаць снопавязалку ня можам.

Тав. **ЛЫЧОЎ:** — А на складзе яна ёсьць?

— Так, яна ляжыць на складзе ў **Дзяржынску** і мы просім тав. **Гікало** аказаць нам садзейнічаньне для атрыманьня яе.

Тав. **ГІКАЛО абяцае калгасу «Чырвоная армія»** дапамагчы ў атрыманьні снопавязалкі і зварачаецца да тав. Бэрнштэйна з пытаньнем, як яны будуць правяраць здачу збожжа ў сэнсе добраякаснасьці яго.

Тав. Бэрнштэйн адказвае, што ў іх выдзелены для гэтай моты 4 чалавека і называе прозьвішчы іх.

Тав. **ГІКАЛО** аднак не задавальняецца адказам:

— **Вам, як старшыні калгасу, трэба асабіста адказваць за якасьць збожжа!** Тав. Гікало коратка ўказвае, якое вялізарнае значэньне мае барацьба за якасьць прадукцыі. **Дзяржава павінна атрымаць толькі высокаякаснае збожжа. Гэта—адна з цэнтральных задач збожжапаставак.**

Тав. Бэрнштэйн добра ўразумеў важнасьць систематычнага кантролю за якасьцю збожжа і абяцае асабіста заняцца гэтай справай. Т. т. **ГІКАЛО і ЛЫЧОЎ** капчаюць гутарку з калгасам «Чырвоная армія» і пераходзяць да другога раёну.

Апаратная выклікае **МАЗЫР...**

— Слова мае **Мазыр!** Альлё, Мазыр! Вам прадастаўляецца слова! Нарэшце пасьпецца адказ.

— Мазыр слухае! Мазыр слухае! Ля мікрафону брыгадзір калгасу **«Чырвоны сьцяг»** Юраўцкага сельсавету тав. **БЛОЦКІ.**

Якаў Іванавіч—зварачаецца да яго тав. **ГІКАЛО**—раскажэце нам, калі ласка, якія настроі ў вашых калгасьнікаў, як яны зьбіраюцца пачаць уборку і збожжаздачу?

І яшчэ рад пытаньняў задае тав. **ГІКАЛО:**

— Як і вы мяркуеце атрымаць ураджай?

Сколькі збожжа і бульбы ў вас выйдзе на працадзень?

— Калі ў вас вызходзяць на работу, а якой гадзіне выходзяць мужчыны і а якой жанчыны?

— Калі вы самі асабіста пачынаеце работу?

— Ці будзе арганізавана вам чырвоны абоз да 1-га жніўня?

— Калі вы пачнеце ўборку ільну?

— Колькі партыйцаў у вашым калгасе, як яны працуюць?

— Як кіруюць раённыя арганізацыі работай вашага калгасу?

На ўсе пытаньні тав. **ГІКАЛО** патрабуе поўных, выразных адказаў. Нічога не павінна быць упоена. Кіраўнік павінен добра ведаць аб усім, чым жыве калгас, усё, чаго не хапае там. Калі адказ недосыць выразны, тав. **ГІКАЛО** паўторна запытвае, патрабуючы ўдакладненьня.

Характэрны інцыдэнт: тав. **ЛЫЧОЎ** запытвае ў тав. **Блоцкага:**

— Скажэце, Якаў Іванавіч, сена вы ўжо здалі дзяржаве?

— Адвезьлі, але...

Тав. **ГІКАЛО:** што але? Кажэце далей.

— ... але яно аказалася дрэннай якасьці. Па першы погляд сена было прыгожым, сухім, а на справе яно было дрэнным.

Тав. **ГІКАЛО:** ну, і што-ж вы зрабілі?

— Прыйшлося вярнуцца назад і адвезьці на прыёмачны пункт іншае сена.

Тав. **ГІКАЛО:** вось, бачыце, Якаў Іванавіч, па прыгожаму выгляду нельга, судзіць, здаваць дзяржаве прадукцыю можна толькі тады, калі вы ўпэўнены, што яна сапраўды высокаякасная.

У т. **СЬВІСТУНОВА** (Полацкі раён) т. т. **ГІКАЛО і ЛЫЧОЎ** запыталіся, як яны арганізуюць ахову ўраджаю, каго вылучылі вартаўнікамі, ці надзейныя люкі, якім дапускаюць ахову калгасных палёў і г. д.

Ад гэтых пытаньняў гутарка пераходзіць да пытаньня аб парадку здачы прадукцыі.

— Як вы мяркуеце здаваць бульбу?—пытае тав. **ГІКАЛО**—непасрэдна з поля, ці спачатку будзеце адвозіць у калгас?

— Непасрэдна з поля.

Т. т. **ГІКАЛО і ЛЫЧОЎ** задаюць новыя пытаньні:

— Якія ў вас віды на ўраджай бульбы?

—Калі вы думаеце скончыць уборку бульбы?

— Хто адказвае за якасьць і за здачу прадукцыі?

— Як у вас з працадзыцыплінай?

— Ці былі вы на зьлёце перадавых сельсаветаў?

Атрымаўшы дакладныя адказы на ўсе гэтыя пытаньні, т. т. **ГІКАЛО і ЛЫЧОЎ** пэўна разьвітваюцца з тав. **Сьвістуновым.**

— Ну, добра тав. Сьвістуноў, мы задаволены вашай інфармацыяй, толькі трэба праводзіць у жыцьцё ўсе абяцаньні, якія вы нам далі.

— Абавязкова выканаем.

— Ну, бывайце...

Слова—**КАПЫЛЮ.** Ля мікрафону старшыня **Трускага** сельсавету тав. **МАЕЎСКІ.**

Пасьлядоўна па парадку ён расказвае аб падрыхтоўцы да сяўбы, аб правяраньні самой сяўбы, праполкі, падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю. За час сяўбы прошант калектывізацыі па сельсавеце вырос з 16,5 проц. да 54,8 проц. Арганізаваліся тры новыя калгасы.

Калі-к тав. **Маеўскі** пераходзіць да пытаньня аб уборцы і абмалоце, паміж ім і тав. **ГІКАЛО** завязваецца цікавы павучальны дыялёг:

Тав. **ГІКАЛО:** Скажэце т. **Маеўскі**, як у вас стаіць справа з абмалотам у аднаасобным сэктары?

— Аднаасобнікі разьбіты на дзесяцідворкі, да іх прымацаваны кіраўнікі з ліку сельсавецкага актыву, якія будуць праводзіць там работу...

— Гэта добра, але ці ёсьць конныя малатарні для аднаасобнага сэктару?

— Ёсьць дзве.

— Адрамантаваныя?

— Так, адрамантаваныя. Але мы думаем выкарыстаць іх для абмалоту ў калгасах.

— А чаму вам не арганізаваць аднаасобнікаў, каб яны малацілі на малатарнях?

Так мы пастанавілі па пленуме сельсавету, лічылі, што аднаасобнікі ня будуць малаціць на малатарнях, а цапамі.

— Як-жа гэта ў вас вышла? Колькі ў вас аднаасобнікаў?

— 273.

— Значыць, 27 дзесяцідворак, чамуж вы не маглі сабраць кіраўнікоў дзесяцідворак, пагаварыць з імі, як яны мяркуюць арганізаваць абмалот, і дабіцца выкарыстаньня малатарняў.

— Мы гэта пытаньне абмяркуем яшчэ на пленуме сельсавету, які адбудзецца 30 ліпеня.

— Не, тав. Маеўскі, вы няправільна робіце. Па-першае, 30 ліпеня нельга скліканць пленум. Ёсьць пастанова вышэйшых органаў аб забароне ўсякіх пленумаў, канфэрэнцый на час уборкі і загатовак. Па-другое, вам ня трэба чакаць, пакуль пленум вырашыць пытаньне. Вы самі павінны асабіста сабраць кіраўнікоў дзесяцідворак і з імі пагутарыць, як арганізаваць абмалот у аднаасобным сэктары **не пазьней, чым у калгасах.** А ў вас вышэйшае так: «аднаасобнік ня хай, моў, працуе цапам, а малатарні аддамо калгасам». Гэта няправільна. Яны-ж і так могуць справіцца з работай, а аднаасобніку трэба дапамагчы. У вас-жа іх яшчэ даволі многа.

Т. т. **ГІКАЛО і ЛЫЧОЎ** задаюць яшчэ новае пытаньне: Як кіруе раён сельсаветам, ці прыймаюць раённыя работнікі, хто яны, што яны робяць у сельсавеце і г. д.

Нарэшце перад самым ужо разьвітаньнем адбываецца новы кароткі дыялёг, які высьвятляе вельмі важны недахоп у рабоце сельсавету.

Тав. **ГІКАЛО:** Ну, бывайце тав. **Маеўскі**, толькі глядзеце, аднаасобнікаў не забывайце... А дарочы, з кім вы спаборнічаеце?

— З суседнім **Вялікі-Раеўскім сельсаветам.**

— А хто каго абгане?

— На некаторых пунктах мы іх, а па некаторых наадварот.

— Масавая работа ў вас праводзіцца?

— Так, праводзіцца.

— Сярод адн

ПЕРШАЕ ЖНІЎНЯ ЗА МЯЖОЙ

Двухгадзінная канфэрэнцыя чэскіх, польскіх і германскіх рабочых

Братаньне чэскіх рабочых з польскімі

ПРАГА, 1 (Белта). З прычыны антываеннага дня першага жніўня сёньня адбылася на БЭСКІДЗКІХ гарах (на граніцы з Польшчай) СУСТРЭЧА ЧЭСКІХ І ПОЛЬСКІХ РАБОЧЫХ, арганізаваная кампартыямі абедзьвюх краін. Сустрэча вялася ў гарачае братаньне чэскіх і польскіх рабочых. Польскім рабочым быў перадан чырвоны сьцяг. Прайшоўшая з энтузіязмам масоўка закончылася сьпевам «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ».

Недалёка ад граніцы трох дзяржаў (пагранічны кут у Сылезіі на граніцы Чэхаславакіі з Польшчай і Германіяй) была праведзена ДВУХГАДЗІННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЧЭСКІХ, ПОЛСКІХ І ГЕРМАНСКІХ РАБОЧЫХ, на якой прымала ўдзел 74 дэлегаты. Прынятая рэзалюцыя заяўляе аб гатоўнасьці польскіх, германскіх і чэскіх рабочых змагацца супроць імпэрыялістычнай вайны і фашызму, у абарону СССР.

У ЖЫЖКОВЕ (прадмесьце Прагі) замест забароненых паліцыяй сходаў, адбылася дэманстрацыя рабочых і беспрацоўных. Дэманстрацыя была разагнана паліцыяй.

Антываенныя артыкулы сёнешніх нумароў равалюцыйных газэт былі зрэзаны цэнзурай, у прыватнасьці забаронены ленінскія антываенныя пёзунгі. Зроблены вобыскі ў рабочых кварталах і арышты рабочых—удзельнікаў стачкі будаўнікоў. У тэкстыльным цэнтры ЦЬВІКАЎ (Чэхія) паліцыя канфіскавала касу і ўсю маёмасьць чырвонага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў. Распушча на таксама мясцовая арганізацыя саюзу пралетарскіх бязбожнікаў. У ГРАДЗЕЦ-КРАЛЕВЕ група работнікаў разумовай працы на чале з прафэсарам Ластавічкай апублікавала адозву, якая заклікае моладзь усіх напрамкаў выбіраць дэлегатаў на антываенны кангрэс моладзі ў Парыжы.

Германія

БЭРЛІН, 1 (Белта). Як паведамляе Вольф, у ноч з 31 ліпеня на 1 жніўня было арыштавана 46 чалавек, якія прабавалі пашыраць камуністычныя першажніўненьскія лістоўкі. Арыштаваных зараз-жа накіравалі ў канцлягер Араніенбург. Газэты паведамляюць, што на адной з цэркваў Бэрліну сёньня раніцою выяўлен надпіс «Рот фронт». У пралетарскім раёне Вэдынгу адбыліся сутычкі паміж камуністамі і штурмавікамі. Камуністы, якія прымалі ўдзел у сутычцы, ня былі злоўлены.

У Ахэне арыштавана 15 чалавек, быц цам членаў антыфашысцкага баявога саюзу. У Эмбурце арыштавана дзьве асобы, быццам камуністычныя кур'еры, у якіх знойдзены камуністычныя агітацыйныя матар'ялы. «Дэйчэ цэйтунг» указвае, што пры арышце паліцыя зьвярнулася да зброі, бо арыштаваныя нібыта аказалі супраціўленьне.

Як паведамляе Вольф, у Тондэрне на нацыянал-сацыялістаў, якія варочаліся з палявых практыкаваньняў, напалі камуністы. У часе сутычкі ў якасьці зброі ўжываліся палкі, лапаты і г. д. Перавага аказалася на баку камуністаў. На месцы сутычкі асталіся параненыя.

Англія

ЛЁНДАН, 1 (Белта). У ГЛАЗГО антываенны камітэт арганізаваў сход, на якім прымала ўдзел 4.000 рабочых. Апрача кампартыі і незалежнай рабочай партыі, быў прадстаўлен рад прафсаюзных арганізацый, у тым ліку машынабудаўнікі і транспартнікі. У адным з кінотэатраў Лёндану студэнты арганізавалі выступленьне супроць паказ у ваеннага фільму.

ПАЗШ

Н'Ю-ЁРК, 1 (Белта) У ЮНІЁН-СКВЭРЫ адбылася дэманстрацыя супроць імпэрыялістычнай вайны і ў абарону СССР. Прымала ўдзел каля 20 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК. Ня гледзячы на гарачыню, якая даходзіла амаль да 38 градусаў, звыш 10 тысяч дэманстрантаў прайшло з чырвонымі сьцягамі і плякатамі па вуліцах гандлёвай часткі гораду. Сярод дэманстрантаў былі рабочыя розных нацыянальнасьцяй, у тым ліку негры, кітайцы і японцы. Прамоўцы ўказвалі на капёсальны рост узбраеньняў і ваенных выдаткаў і патрабавалі скарыстаньня гэтых грошай на падтрыманьне беспрацоўных. Надпісы на плякатах кляймілі фашысцкі рэжым Германіі і са кампартыі вітаў іх і заклініміў ганьбаю здрадніцкія паводзіны сацыял-фашысцкіх лідэраў. Дэманстрацыі супроць вайны адбыліся па ўсіх Злучаных Штатах і ў Лацінскай Амэрыцы.

Японія

ТОКІО, 2 (БЕЛТА). Ня гледзячы на ўзмоцненыя паліцэйскія меры, у радзе раёнаў ТОКІО першага жніўня пашыралася антываенная літаратура і лістоўкі. Арыштавана 26 чалавек па абвінавачаньні ў кіраўніцтве падрыхтоўкай да антываеннай дэманстрацыі.

У НАГОЯ першага жніўня была арганізавана дэманстрацыя новым прафсаюзным аб'яднаньнем Кіогікай. Дэманстрацыя была расьсеяна паліцыяй, якая арыштавала некалькі чалавек. У раёне морскага арсэналу Коісікава пашыраліся першажніўненьскія лістоўкі.

Кітай

ШАНХАЙ, 2 (Белта). Першага жніўня ў кітайскай частцы гораду тры разы рабочыя прабавалі арганізаваць дэманстрацыю. Паліцыя разганяла дэманстрантаў і арыштавала некалькі чалавек. У прамысловых раёнах кітайскай часткі гораду і замежных канцэсій пашыраліся антываенныя лістоўкі.

Галяндыя

АМСТЭРДАМ, 2 (Белта). Першага жніўня ва ўсіх буйных гарадох, а таксама ў радзе дробных гарадоў і вёсак Галяндыі былі праведзены антываенныя мітынгі. На мітынгу ў Амстэрдаме пад адкрытым небам прымала ўдзел звыш 2.000 рабочых.

Латвія

РЫГА, 1 (Белта). Мінулай ноччу на ўскраінах былі нападжаны пятучыя рабочыя мітынгі. Патрулі паліцыі і паліцэйскай варты разагналі дэманстрантаў. Арыштован рабочы, які раздаваў камуністычныя адозвы. Двое рабочых, якія прабавалі вызваліць яго, таксама арыштаваны.

Праведзен вобыск у памяшканьні саюзу «левых дэмабілізаваных воінаў і барацьбітоў за свабоду». Арыштавана некалькі членаў саюзу. Саюз абвінавачваецца ў скіраваньні антыфашысцкай канфэрэнцыі ў Рызе, на якой выступаў дэпутат рабоча-сялянскай фракцыі сойму.

Гішпанія

ПАРЫЖ. (БЕЛТА). Як паведамляюць з ГІШПАНІІ, першага жніўня ў Сэвільлі пачалася ўсеагульная забастоўка пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Пастанова ЦК УсеКП(б)

1. Прызначыць начальнікам Палітыкіраўніцтва Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін тав. ПАЛОНСКАГА У. І., з аслабаненьнем яго ад пасады Заг. Аргаддзелам ЦК УсеКП(б).

2. Прызначыць намесьнікам начальніка Палітыкіраўніцтва Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін тав. ЗІМІНА І. Н.

3. ПРЫЗНАЧЫЦЬ НАЧАЛЬНІКАМІ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ ЧЫГУНАК:

а) Паўднёвай чыгункі — тав. ВАНЬЯНА А. Л.

б) Паўднёва-Заходняй чыгункі — тав. МІЛХА Л. Р.

в) Екацярынінскай чыгункі — тав. ДАНЕНКА В. А.

г) Паўночна-Каўказкай чыгункі — тав. РОЗЭНТАЛЯ Я. Д.

д) Паўднёва-Усходняй чыгункі — тав. БЭРГАВІНАВА С. А.

е) Маўскоўска-Курскай чыгункі — тав. УШАРЭНКА А. Б.

ж) Маскоўска-Казанскай чыгункі — тав. КУЧМІНА І. Ф.

з) Заходняй чыгункі — тав. РУТЭНБУРГА А. М.

і) Маскоўска-Бальтыцка-Беларускай чыгункі тав. ДЗЕГЦЯРОВА Л. С.

к) Паўночнай чыгункі — тав. ВАРАПАЕВА Ф. Г.

л) Кастрычніцкай чыгункі — тав. ПЕРАПЕЧКА Н. Н.

м) Мурманскай чыгункі — тав. ЧАПЛІНА Н. П.

н) Пермскай чыгункі — тав. ШАХГІЛЬДЗЯНА В. П.

о) Омскай чыгункі — тав. ВАЛОДЗІНА В. Г.

п) Томскай чыгункі — тав. ПАНАМАРОВА С. В.

р) Забайкальскай чыгункі — тав. ВІНАКУРАВА В. В.

с) Усурыйскай чыгункі — тав. КОПА І. М.

т) Сярэдня-Азіяцкай чыгункі — тав. КАРЫБА Г. М.

у) Туркестанска-Сібірскай чыгункі — тав. Кісялёва А. Д.

ф) Закаўкаскай чыгункі—тав. ШВАРЦА С. С.

х) Разана-Уральскай чыгункі — тав. ГОРШЫНА І. Б.

ц) Самара-Златаўстаўскай чыгункі — тав. НІКУЛІНА А. А.

ЦК УсеКП(б).

Загад народнага камісарыяту земляробства Саюзу ССР

Ад 31-га ліпеня 1933 г.

Усім дырэктарам МТС, копія--абласным (краявым), рэспубліканскім зямельным кіраўніцтвам і трактарацэнтрам

Краявымі (абласнымі, рэспубліканскімі) цэнтрамі вам уручана мінімальнае, зробленае з разьліку сярэдняга ўраджаю, заданьне па здачы дзяржаве збожжа, якое атрымліваецца МТС ад калгасаў у парадку натураплаты работ, праведзеных МТС у калгасах.

Многія МТС маюць поўную магчымасьць, з прычыны высокага ўраджаю, перавысіць данае ім заданьне, але некаторыя МТС пад усякімі прадлогамі шляхам няправільных разьлікаў утойваюць гэту відавочную магчымасьць.

Загадваю:

1. Не пазьней 5-га жніўня — па Украіне, Крыме, Паўночным Каўказе, Ніжняй Волзе, рэспубліках Закаўказьзя і Сярэдняй Азіі, Паўднёвай і Алма - атынскай абласьцях Казакстану і не пазьней 15 жніўня — па іншых абласьцях, краёх і рэспубліках закончыць падлік усіх работ, праведзеных увосень 1932 году і аплачваемых з ураджаю гэтага году ўсіх трактарных веснавых работ і работ па ўборцы.

2. Спагнаньне натураплаты з калгасаў і здачу збожжа дзяржаве рабіць у разьмерах, устаноўленых плянам недакладка з пачатку ўборкі з тым, каб канчатковы разьлік МТС з кожным калгасам быў праведзен у 5-ці дзенны тэрмін пасьля ўстанаўленьня ўраджайнасьці для раёну дзяржкамісіяй па ўраджайнасьці.

Усякае ўхіленьне ад спагнаньня і утойваньне належачага за работу МТС збожжа зьяўляецца пакражай дзяржаўнага збожжа і будзе карацца па закону.

НАРКАМЗЕМ САЮЗУ ССР
Я. ЯКАЎЛЕЎ.

РАШАЮЧАЯ ДЭКАДА—

да 15 жніўня павінна мабілізаваць усе арганізацыі на выпуск стабільных падручнікаў

Зводка выданьня стабільных падручнікаў па ДВБ на 2-VIII 1933 г.

Павінна быць надрукавана 100 падручнікаў з агульным тыражом 2.800 тыс. экз.

Выйшлі з друку 44 падручнікі (з іх беларускіх—34, яўрэйскіх,—7, польскіх —2, літоўскіх—1) з агульным тыражом 1.660 тыс. экз.

Здана ў друкарню 89 падручнікаў.

У НКА знаходзіцца 7.

У ДВБ—2.

У аўтараў—2.

Усяго здана на базу 35 падручнікаў, з тыражом у 1.151.327 экз.

Усяго адгружан на раён 31 падручнік з тыражом 1.023.1[illegible]. Саюзтрансам забрана за 1-VIII 10.575 экз. Засталося ўпакаваных 66.500 падручнікаў.

Кантрольная пічба друкарні імя Сталіна—40.000 падручнікаў, выпушчана на сёньня—42.200 экз.

Загадчык вучпэдсэктару
М. ДУБРАВІЦКІ.

Пасьля некалькіх сыгналаў «Зьвязды», пасьля куставога партсходу, склі канага Менгаркомам КП(б)Б, ячэйка Белдзяржвыдату пачала перабудову сваёй работы ў бок больш канкрэтнага кіраўніцтва. Чыстка партарганізацыі друкарні імя Сталіна таксама зьявілася рашаючым момантам у перабудове работы друкарні, па выкананьні дырэктыў партыі аб стабільных падручніках. Друкарня штодзенна перавыконвае норму, ліквідавала «вузкае месца» ў стэрэатыпным цэху.

Створаны ўсе ўмовы для выкананьня задачы: да 15 жніўня даць нашай палітэхнічнай школе стабільныя падручнікі.

На 2-VIII 1933 г. мы дабіліся выданьня 44 падручнікаў, з агульным тыражом 1.660.000 экз. Гэта крок наперад, які забясьпечвае выпуск падручнікаў да 15 жніўня 1933 г. Але-ж гэта не павінна задаволіць. Зусім наяўная пагроза з выданьнем літоўскіх падручнікаў. З 11-ЦІ УСЯГО ВЫШАЎ З ДРУКУ АДЗІН ПАДРУЧНІК. ДВБ прыняло рад мер па разьмяшчэньні часткі падручнікаў у Маскве. У друкарні імя Сталіна яшчэ застаюцца 32 падручнікі з тыражом у 409.000 экз.; у Папедруку —7 падручнікаў з тыражом 115 тыс.; у Маскве—3 з тыражом 510 тыс.; у друкарні Беларускай Акадэміі Навук — 1 падручнік з тыражом 8 тыс.

Беларуская Акадэмія Навук павінна дапамагчы ў выпуску аднаго літоўскага стабільнага падручніка па прыродазнаўстве, ч. II (аўтара Цяцюрава). Для выданьня гэтага падручніка друкарня БАН мае ўсе магчымасьці. Загадчык выдавецтва Акадэміі Навук тав. СІНІЦКІ павінен прыняць неадкладныя меры па выданьні гэтага падручніка.

Задача, якая стаіць перад друкарняй імя Сталіна—гэта выдаць у тэрміны ўсе праграмы для пачатковай і сярэдняй школы. У выданьні «Праграмы па геаграфіі» (для сярэдняй школы) друкарня паказала сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. Гэта праграма ўжо выйшла з друку. Зараз застаецца да 5-VIII выпусьціць усе іншыя праграмы для школы з такім разьлікам, каб настаўнікі іх атрымалі за 8-10 дзён да настаўніцкіх канфэрэнцый.

Застаецца па сёнешні дзень трывожным становішча з прасоўваньнем падручнікаў да школы. Усяго на раён адгружан адзін мільён падручнікаў. На мясцох дрэнна ўпакоўваюць падручнікі, блытаюць адрасы, агідным чынам не выкупляюць прыбыўшых на раён падручнікаў, што тлумачыцца бязьдзейнасьцю раённых кіруючых арганізацый. Да гэтага дня пры рассылцы 29 падручнікаў некаторыя раёны атрымалі ўсяго па 8-9. Трэба памятаць, што за сваячасовае забесьпячэньне школ падручнікамі, за сваячасовы выкуп апошніх адказвае непасрэдна кіраўніцтва райана.

Дрэнна і з забесьпячэньнем яўрэйскімі і польскімі падручнікамі, якія выдае украінскі нацменвыдат. З 33-х назваў яўрэйскіх і стольких-жа польскіх падручнікаў ён недаслаў нам НІ АДНАГО ПАДРУЧНІКА СВАЙГО ВЫДАНЬНЯ. Гэта патрабуе ад кіраўніцтва Наркамасьветы рашучых мер па ліквідацыі гэтага прарыву.

Пабудуем эскадрыльлю імя Кагановіча

КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ АДКАЗАЦЬ НА ВЫКЛІК ГОМЕЛЬСКІХ РАБОЧЫХ І КАЛГАСЬНІКАЎ

Ініцыятыва гомельскіх рабочых і калгасьнікаў аб пабудове эскадрыльлі імя тав. КАГАНОВІЧА сустрэла жывы водгук сярод шырокіх працоўных мас Савецкай Беларусі. На прадпрыемствах, у калгасах ідуць зборы сродкаў на гэту важнейшую справу. Аднак, творчая ініцыятыва не заўсёды мае падтрыманьне з боку некаторых раённых арганізацый. Узяць хоць-бы такія буйныя цэнтры, як ВІЦЕБСК, МЕНСК, БАБРУЙСК, БАРЫСАЎ, МАГІЛЕЎ, ВОРША, там далей славесная балбатні справа не пашла. Пакуль што ў габнізах рённых арганізацый займаюцца яшчэ складаньнем плянаў, распрацоўкай інструкцый і г. д. У той-жа час перадавыя прадпрыемствы разгортваюць работу па зборы сродкаў.

Менскі завод імя МЯСЬНІКОВА сабраў больш 3.000 руб. на пабудову эскадрыльлі. Тое самае можна сказаць і аб іншых прадпрыемствах. Аднак, арганізацыйнага афармленьня ў самым менскім гаркоме гэта справа не атрымала.

Надзвычай дрэннае становішча з пераводам сродкаў. Многія арганізацыі сабралі вялікія сумы грошай і трымаюць іх у сябе, не пераводзячы на бягучы рахунак (№ 160/700314, Менск, Дзяржбанк). Гэта зьяўляецца недапушчальным, бо не дае магчымасьці аператыўна кіраваць гэтай справай.

Украм бальшавіцкай работы можа служыць гомельская арганізацыя, якая гату ініцыятыву рабочых і калгасьнікаў ператварыла ў справу тысячных. Па прыкладу Гомелю павінны раўняцца ўсе арганізацыі і ў першую чаргу такія буйнейшыя цэнтры, як МЕНСК, ВІЦЕБСК, МАГІЛЕЎ, ВОРША, БАБРУЙСК, БАРЫСАЎ.

* Рабочыя і служачыя і вучні Магілёўскага таварыства «Прыхільнікі дзяцей» сабралі 300 руб. на пабудову эскадрыльлі імя Кагановіча і абавязаліся ў бліжэйшыя дні давесьці збор да 500 руб.

* Агульны сход рабочых пабудовы Дзяржынскага Дзяржбанку пастанавіў адпрацаваць дзень у карысьць пабудовы эскадрыльлі імя Кагановіча і выклікалі пасьледваць іх прыкладу ўсіх будаўнікоў Дзяржынску.

* Ячэйка КСМ саўгасу «Камсамольская праўда» (Аршанскі раён) сабрала 50 рублёў на пабудову эскадрыльлі і выклікала на сацпабо[illegible]цтва ўсе камсамольскія ячэйкі ра[illegible]

Культурнае абслугоўваньне дзяцей

Калегія Наркамасьветы БССР вызначыла рад мерапрыемстваў па культурным абслугоўваньні піянэраў і школьнікаў. Перад Белдзяржкіно пастаўлена пытаньне аб арганізацыі ў Гомелі, Віцебску, Магілеве і Воршы па аднаму дзіцячаму кінотэатру, і аб наладжваньні спэцыяльных кіносэансаў для дзяцей — у іншых гарадох БССР. Разам з гэтым даручана на працягу 1933-34 г. кінофікаваць 200 прымежных школ.

У гарадох Менску, Віцебску, Мозыру і Слуцку будуць арганізаваны дзіцячыя клюбы. Адказнасьць за арганізацыю ўскладзена на гар. і райана. У Менску пры дзяржаўнай бібліятэцы і бібліятэчным інстытуце намечана арганізаваць кабінэт дзіцячай літаратуры, які зьявіцца цэнтрам літаратурна-мастацкага кіраўніцтва дзецьмі.

Аб вырабе дражджавых сыраў

У мінулым годзе ў лябараторыі біялёгічнага інстытуту Беларускай Акадэміі Навук былі зроблены першыя досьледы па скарыстаньні кансэрваваных дражджаў, з мэтай вырабу з іх дражджавых сыраў. Вынікі атрымаліся вельмі здавальняючыя і вопытныя работы былі перанесены на мясцовы завод.

Кансэрвацыя дражджаў робіцца кухоннай сольлю, пры дабаўленьні якой дражджы хутка становяцца радкімі і прымаюць сьметанападобную кансыстэнцыю і могуць захоўвацца ня гніючы больш як год. Прыблізна праз адзінаўтара месяца кансэрваваныя дражджы набываюць пах галяндзкага або швайцарскага сыру і цалкам прыгодны для кармленьня жывёлы, а таксама для сумесі пры выпечцы хлеба, што абагачае апошні каштоўнымі бялковымі матэрыямі.

Для вырабу з кансэрваваных дражджаў дражджавых сыраў неабходна да 50-75 проц. тварагу дадаць 50-25 проц. кансэрваваных дражджаў, якія набылі ўжо пах галяндзкага сыру. Атрыманая такім чынам маса, добра перамешаная і расьцёртая, дае дражджавы сыр, [illegible] па смаку і спажыўной адольнасьці адпавядае галяндзкаму сыру.

Вітамінавая каштоўнасьць дражджавога сыру безумоўна стаіць вышэй, чым сыру галяндзкага, акрамя таго дражджы вылечваюць рад хвароб.

Выраб дражджавых сыраў павінен мець асабліва вялікае значэньне для тых малочных заводаў, якія знаходзяцца ў мала заселеных пунктах і дае тое рог ня можа быць зараз-жа выкарыстан для харчаваньня, а патрабуе перапоўкі, у часе якой часта псуецца.

А. Поляк.

Паведамленьні

Менгарком КП(б)Б выпучыў для правадзеньня падрыхтоўчай работы да гарадзкога зьлёту работніц-вынаходцаў, рацыяналізатараў, герояў першай пяцігодкі наступных т. т.:

Рубенчык (гар. КК РСІ)—завод імя Варашылава; Бэрліна (Наркамлёгпрам) —ф-ка «Кастрычнік»; Грумбіна (рэд. «Раб. і калгасын. Бел.»)—кушнерная ф-ка; Ярмакова (Наркамцяжпрам)—зав. ланцугоў «Галя»; Тур (ЦС АСО)—зав. «Ударнік»; Рагазіньнікава («Зьвязда») —ф-ка 8-га сакавіка; Цыпіна (рэд. («Бальшавіцкі друк») — ф-ка «Чырв. тэкст.»; Сапдаценка (гарпрафсавет)—друкарня імя Сталіна; Лібэнзон (Бімпо) —хлебазавод; Фарбэр (гаржыпсаюз)—арцель імя Крупскай; Эльніну (МЦРК) —шчотачная ф-ка; Фэльдман—ф-ка «Камунарка»; Точка (Чыг. Чырв. Крыж)—Дэпо; Рохліна (гарсавет)—ф-ка «Ўсход»; Дубровенская (Наркамцяжпрам)—зав. імя Молатава; Крэсін (Дзяржбанк) — зав. «Бальшавік»; Шынк (Наркамвост) —зав. імя Мясьнікова; Круглін (ЦК)—трампарк; Копелева (ЦК)—абутковая ф-ка;

Вызначаныя таварышы павінны зьявіцца на кансультацыю 4-га жніўня а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні не рэдакцыі —Савецкая 63, 3-ці паверх, пакой № 11.

Апітмас ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

4 жніўня, у 6 гадзін вечара, рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА" сумесна з СЭКТАРАМ СНАБЖЭНЬНЯ НАРКАМЗЕМУ

ПРАВОДЗІЦЬ ШЫРОКУЮ НАРАДУ

па пытаньні завозу ў раёны гаручага і змазачных матар'ялаў.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі ўсіх трактарацэнтраў, Насенсаўгастрэсту, садова-агароднага трэсту, Лугтрэсту, Наркамсаўгасаў, менскіх Сьвінаводтрэсту, Малакапрамтрэсту, Птушкатрустрэсту упаўнаважаны Саюзнафтгандлю, загадчык менскага нафтаскладу.

Усе таварышы павінны будуць зрабіць інфармацыю аб становішчы завозу гаручага па сваіх сыстэмах.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА" 3-ці паверх.

Забастоўка гарнякоў у Пэнсыльваніі

Н'Ю-ЁРК, 1 (Белта). Лік гарнякоў, якія бастуюць у ПІЦБУРСКІМ раёне (штат Пэнсыльванія) перавысіў ужо 20 тысяч. Стачка паралізуе адзін з важнейшых вугляпрамысловых цэнтраў краіны і наносіць вялікія страты «Юнай тэд Стэтс стыль корпорэйшэн», якая кантралюе гэтыя шахты, а таксама іншым буйным сталяліцейным кампаніям.

Забастоўкай афіцыяльна кіруе аб'яднаны саюз гарнякоў, які далучаецца да рэакцыйнай амэрыканскай фэдэрацыі працы.

Рэакцыйныя прафбюракраты, каб шырэй і арганізаваней уключыцца ў прадугледжанай праграмай Рузвэльта апарат «клясавага супрацоўніцтва» з ад нага боку імкнуцца пацягнуць за сабою рабочых дэмагогічнымі посупамі аб павышэньні зарплаты, на аснове закону аб—«аднаўленьні прамысловасьці» і ў некаторых выпадках даюць сваю санкцыю забастовачным выступленьням. Але адначасова яны ўсямерна стараюцца моцна зарэкамэндаваць сябе перад прадпрыемцамі і робяць усё ад іх залежнае, каб падрываць баявую сілу рабочых. У Пэнсыльваніі яны ўсямерна, але безрэзультатна стараюцца ўтрымаць баставых ад масавага выступленьня пікетаў.

За апошнія дні шмат пікетчыкаў было паранена. Сёньня 27 аўтамабіляў з штрэйкбрэхэрамі пранесьліся міма пікетчыкаў і адкрылі агонь. Бастуючыя адказалі градам каменьняў. У раёны стачкі апрача паліцыі, стражнікаў, паспаны войскі.

Перад паездкай Эрыё ў СССР

ПАРЫЖ, 2. (ТАСС). Парыскі карэспандэнт «Известий» паведамляе: «Па вестках французскага друку, ЭРЫЁ з жніўня выяжджае праз Турцыю ў СССР.

У гутарцы з прадстаўніком Ліёнскага «САЛЮ ПЮБЛІК» Эрыё з поваду сваёй паездкі зрабіў наступную заяву, зьмешчаную ва ўсім парыскім друку:

«Я еду ў СССР, як і ў 1922 годзе, з адзіным намерам папрабаваць поўнасьцю ўцяміць сабе становішча СССР. Я лічу, што больш неабходна асабіста азнаёміцца са становішчам, асабіста перагаварыць з людзьмі, завязаць прыяцельскія адносіны з людзьмі, якія лічацца далёкімі нам па сваім культурным складзе і сацыяльным становішчы. Я нічога не намеран рабіць у Расіі іншага, апрача як глядзець, вывучаць і путарыць. Я тым больш ахвотна еду туды, што я шчасьлівы (прычым я не зьяўляюся ў гэтых адносінах адзіным чалавекам ва Францыі), што ў 1924 годзе мне ўдалося аднавіць адносіны з СССР і я ганаруся тым, што здолеў дабіцца падпісаньня пакту аб ненападзе. Мы павінны думаць аб будучым нашай краіны з пункту гледжаньня папітычнай і эканамічнай і не заставацца за жалезнымі кратамі. Я з вялікім задавальненьнем пабачу таксама дзяржаўных дзеячоў Турцыі, з якімі ў мяне заўсёды былі добрыя адносіны».

Прыезд прадстаўнікоў ангельскай каапэрацыі ў Маскву

МАСКВА, 2 (Белта). 30 ліпеня ў Маскву прыбылі прадстаўнікі ангельскага каапэрацыйнага таварыства аптовых закупак п. п. Рэбінсон, Макфадэн і Дэвіс, якія думаюць наведаць рад прамысловых цэнтраў і партоў Савецкага Саюзу (Горкі, Харкаў, Крым Дняпрагэс, Адэсу).

31 ліпеня яны былі прыняты старшынёю прэзыдыуму Цэнтрасаюзу СССР і РСФСР тав. І. А. Зяленскім.

Перад усеагульнай забастоўкай ва Францыі

ПАРЫЖ, 1 (Белта). Згодна паведамленьня «Юманітэ», сёньня ў Страсбургу на агульным сходзе дэлегатаў трох арганізацый: усеагульнай унітарнай канфэдэрацыі працы (рэвалюцыйнай), усеагульнай канфэдэрацыі працы і хрысьціянскіх прафсаюзаў прынята рэзалюцыя аб абвяшчэньні ўсеагульнай стачкі салідарнасьці з рабочымі-будаўнікамі, якія бастуюць ужо 6 тыдняў за павышэньне зарплаты, і з рабочымі бляхарамі, якія бастуюць ужо 2 тыдні. Стачка будзе праводзіцца таксама ў знак пратэсту супроць заключэньня ў турму 6 забастоўшчыкаў.

Рабочыя боень і муніцыпальныя служачыя Страсбургу ўжо ўчора спынілі работу.

У горадзе Кастр (дэпартамант Тарн) 1000 рабочых тэкстыльшчыкаў бастуюць супроць зьніжэньня зарплаты.

Неабмежаваная ўлада савету міністраў у Германіі

БЭРЛІН 31 (Белта) «Дэйчэ альгемэйнэ цэйтунг» паведамляе, што па новаму рэгляманту работы савету міністраў усе законы прымаюцца простаю большасьцю і ўступаюць у сілу на наступны дзень пасьля іх апублікаваньня. У новым рэгляманце асобна агаворана, што для заключэньня дагавораў з замежнымі дзяржавамі няма патрэбы ў рашэньні рэйхстагу. Скасоўваецца таксама парадак, пры якім прыняты закон падпісваецца і ўводзіцца ў сілу прэзыдэнтам Германіі. З гэтага часу гэта функцыя прэзыдэнта пераходзіць да канцлера.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА ДАМЭЦ г. Масква.

Гарадзкі сад

ДЗЯРЖЦЫРК—ШАПІТО

З 2 жніўня і штодзенна абноўленая праграма вялікі паказ у 3-х аддзяленьнях.

Прыехалі і выступаюць 4—ДЖЫОВАНІ—4 паветраны палёт пад купалам цырка.

Гастролі папулярнага артыста Леаніда ІВАНОВА —група дрэсыраваных сабак, малпаў, вярблюдаў, поні і інш.

Замежная стайня КАЙЗЭР-БАРУМ— новая дрэсыроўка.

Паліт-сатыра ДАМІРАЎ і ГУРСКІ новы рэпэртуар.

ВЯСЁЛЫЯ КАЧАГАРЫ— матроскія скокі.

Германскі атракцыён ПАУЛЬТОН і ДОЛЕЙ— цыклісты-вялёсыпрадысты.

Францускі артысты 3—ФАБРЫ—3 жанглёры на кані.

На арэне ўвесь вечар ЧАРЛІ ЧАПЛІН і яшчэ 15 савецкіх і замежных нумароў.

Пачатак у 9 гадзін увечары. Прымаюцца заяўкі на мэтаныя спэктаклі і культпаходы. УВАГА: 6—12—18—24 і 30 жніўня вялікія дзенныя паказы па спэцыяльнай праграме пры ўдзеле ЛЕАНІДА ІВАНОВА з усёй трупай дрэсыраваных жывёл. Дырэктар ПОЗЬНЯК.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

Сёньня 3-га жніўня і штодзенна

лепшы замежны фільм

ВАЛАЦУГА

ПАЧАТАК 1-га сэансу ў 6 гадз. веч.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Ад 1-га жніўня

мастацкі фільм вытворчасьці САЮЗКІНО

„ПАЭТ і ЦАР"

Рэжысэр В. Р. Гардзін.

У галоўных ролях: Б. Тамарын, М. Карэнін, Е. Чарвякоў, І. Валодзька і Д. Ліхачоў.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-хроніка САЮЗКІНО.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня. Чортава кошачка камэдыя ў 6 частках.

„СПАРТАК" Каса—а 3 г. 30 м. Замежная камэдыя ХРЫЗАНТЭМА ў 6 частках

ДЗІЦЯЧЫ ГУЛЯЎНЫ кіно-тэатр 3-я СЭРЫЯ Чырвоныя д'ябаляты („САВУР МАГІЛА")

АНОНСІ

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" гэтымі днямі НА ЭКРАНЕ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ

АПОШНІ РАМІЗЬНІК БЭРЛІНУ

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ паведамляе, што прыём плацяжоў за электраэнэргію праводзіцца з 1-га па 8-га жніўня ўключна з 8 а наловай раніцы да 6 гадз. вечара.

Прыём плацяжоў у ашчадкасах з 1-га жніўня ОПЫНЕН.

Электрастанцыя.

МЕНСКІ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ТЭХНІКУМ пры НКФ БССР абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР

студэнтаў на першы курс фінансавага аддзяленьня па спэцыяльнасьцях: інспэктараў дзяржстраху, дзяржпадаходу і бюджэту. Тэрмін навучаньня—3 гады. Прыём заяў да 15-га жніўня. Іспыты па: грамадазнаўстве, матэматыцы, фізыцы, хэміі і бел. мове ў абёме сямігодні пачуцця а 25-га жніўня. Заняткі з 1-га верасьня. Да заяў патрэбна прыкладаць дакументы (у арыгіналах) згодна дадзенага НКА і марак на 40 кап. для адказу. Усе залічаныя забясьпечваюцца інтэрнатам. Стыпэндыяй забясьпечваюцца на агульных падставах.

Адрас: Менск, вул. Вызваленьня, 8, (26 ФЗС).

Дырэкцыя ФЭТ.

ГУМАЗБЫТАМ Беларускае аддзяленьне, Савецкая, 65 — праводзіцца — прыём заявак на 1934 г. на гумава-азбэставыя вырабы ад прадпрыемстваў БССР, што ўваходзяць у аб'яднаньні, падведамственыя наркаматам саюзнага значэньня.

Для бесьперапыннага снабжэньня ў 1934 г. заяўкі павінны быць прадстаўлены да 15-га жніўня 1933 г., для чаго належыць да 5-га жніўня атрымаць адпаведныя формы заявак.

Прадпрыемствы, не прадставіўшыя да ўказанага тэрміну заяўкі, будуць зьняты са снабжэньня.

Прадпрыемствы рэспубліканскага і мясцовага значэньня падаюць заяўкі Белдзяржснабу (Менск), тым, што знаходзяцца на прэрфэрыі—адпаведнаму аддзяленьню Белдзяржснабу, дзе і атрымліваюць адпаведную форму заявак.

Гумазбыт Белдзяржснаб.

СТАРА-БАРЫСАЎСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае прыём на 1 курс.

Заявы прыймаюцца да 15 жніўня. Пачатак заняткаў 1-га верасьня. Тэрмін навучаньня 3 гады. Усе студэнты карыстаюцца інтэрнатам і забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 40 да 60 руб.; пры тэхніку ня ёсьць свае сталоўкі. Без іспытаў прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодкі, падрыхтоўчыя курсы ШКМ. У тэхнікум прымаюцца рабочыя саўгасаў, іх дзеці, батракі, калгасьнікі, дзеці спэцыдзістаў. Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-сьвінаводаў. Да заявы патрэбны даку маенты: 1) анкета, завераная сельсаветам або прафарганізацыямі, 2) пасьвед чаньне аб адукацыі, 3) аб сацыяльным становішчы, 4) аб праве голасу, 5) аб здароўі, 6) аб узросьце і адносінах да вайсковай павінасьці. Адрас: Стара-Барысаў, Барысаўскага раёну, Сьвінагадоўчаму тэхнікуму.

Дырэкцыя.

На падставе пастановы СНК СССР ад 19-VII—33 г. № 1526, з 1-га жніўня 1933 году Аршанскае раённае чыгуначнае спажывецкае таварыства Р